Т. Л. Ляшчынская С. С. Аніскевіч

# Беларуская мова 3

Частка 1




Добры дзень!


Запрашаем!


Добрай раніцы!


Калі ласка!


Прабачце!


Дзякуем!


Да пабачэння!


Віншуем!

Т. Л. Ляшчынская   С. С. Аніскевіч

# Беларуская мова

**Вучэбны дапаможнік для 3 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання**

У дзвюх частках
Частка 1

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2019

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075.3-056.3)
ББК 81.411.3я721
Л99

Рэцэнзенты:
кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. Г. Міхалевіч*);
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Чэхаўшчынская дапаможная школа-інтэрнат» *Н. Г. Рубацкая*

## Умоўныя абазначэнні

— правіла


— **Паразмаўляем** — камунікатыўнае практыкаванне


— **Хвілінка-весялінка** — практыкаванне займальнага характару

* — заданне павышанай складанасці

! — звярніце ўвагу

**Ляшчынская, Т. Л.**
Л99 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. першага аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 1 / Т. Л. Ляшчынская, С. С. Аніскевіч. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. — 135 с. : іл.
ISBN 978-985-553-595-0.

**УДК 811.161.3(075.3-056.3)**
**ББК 81.411.3я721**

**ISBN 978-985-553-595-0 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-553-594-3**

© Ляшчынская Т. Л., Аніскевіч С. С., 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2019

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЎТАРЭННЕ

## *Урок 1*

**1.** Праслухайце верш. Разгледзьце малюнак.



***

У школу рана мы прыйшлі,
кнігі, сшыткі прыняслі.
Нас настаўнік сустракае,
добрых поспехаў жадае.

*П. Макаль*

Куды прыйшлі дзеці?
Хто сустракае дзяцей?
Што прынеслі дзеці ў школу?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раскажыце пра ваш першы дзень у школе.
Хто прывёў вас у школу?
Каго са сваіх сяброў вы сустрэлі?
З кім вы сядзіце за партай?



**Паразмаўляем**

**2.** Пакажыце з суседам па парце, як вы вітаеце адзін аднаго. Іншыя дзеці адзначаюць, што спадабалася ў кожнай пары.

Узор. — Добры дзень, Алесь.
— Добры дзень, Алена.

**3.** Гучна і выразна скажыце сваё імя́. Прачытайце імёны.

Саша, Маша, Яна, Крысціна, Алег, Юра, Люда, Мікіта, Іра, Насця, Паша, Марына, Паліна.

Выпішыце ў сшытак тыя імёны, якія вам падабаюцца. Не забывайцеся пісаць імёны з вялікай літары.
Запішыце сваё імя.

**4.** Праслухайце верш. З якога дрэва ліст на малюнку? Якога колеру ліст клёна? Да чаго ён падобны?



**У асенні дзень**

Ляжыць на сцежцы яркі ліст барвовы.
Глядзіць Пятрусь і разважае так:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А можа, гэта і не ліст кляновы,
а лапку тут сваю згубіў гусак.

*І. Муравейка*



Складзіце і запішыце ў сшытак сказ са спалучэннем слоў *барвовае лісце*.

*5. Прачытайце словы.

Алоўкі, сшыткі, гумка, ранец, ручка, пенал, партфель, падручнікі, лінейка.

Выпішыце ў сшытак назвы рэчаў, якімі вы карыстаецеся.

*Урок 2*

6. Прачытайце тэкст.

**Сяброўкі**

Вольга і Насця — сяброўкі. Яны вучацца ў адным класе. Дзяўчынкі разам ходзяць у школу. Сяброўкі сядзяць за адной партай. Яны старанна вучацца. Вольга і Насця дапамагаюць адна адной.

Спішыце тэкст у сшытак.

З кім вы сябруеце?
З кім вы ходзіце ў школу? (З бабуляй, дзядулем, сябрам, сяброўкай, мамай, татам.)



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***7.** Разгледзьце дзяўчынак на малюнках.



Алена



Зося

1. Якога колеру вочы ў Алены? Якога — у Зосі? (Блакітныя, шэрыя, чорныя.)
2. Якія ў дзяўчынак валасы? (Доўгія, кароткія, светлыя, цёмныя.)

Запішыце ў сшытак, якога колеру валасы ў Алены і ў Зосі.

**8.** Прачытайце словы.

Іван, Мінск, Мір, Ірына, крыніца, суніцы, сініцы, вучні.

Якая літара паўтараецца ва ўсіх словах?
Напішыце вялікую і маленькую літару **І і** ў паветры.
Запішыце ў сшытак літары і словы па ўзоры.

*І і Іван – Ірына*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**9.** Слухайце і паказвайце рухамі, што вы робіце раніцай.

...Пачынаем дзень спачатку
фізкультурнаю зарадкай.
З мылам мы пад кранам мыем
рукі, вушы, твар і шыю.

*А. Александровіч*

Спішыце першы сказ у сшытак.



**Хвілінка-весялінка**

**10.** Прачытайце верш.

**Мара**

Корміць ката свайго Пецю як след,
дзеліць сняданак ён з ім і абед.
Марыць: «Ката адкармлю, як каня,
будзе вазіць мяне ў школу штодня».

*В. Савасцюк*

Што вы знаходзіце смешнага ў мары хлопчыка?

*Урок 3*

**11.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце агародніну і садавіну. Што вам больш падабаецца з садавіны і агародніны?









Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Запішыце ў сшытак словы па ўзоры.

| **Садавіна** | **Агародніна** |
| --- | --- |
| *грушы* | *морква* |

Словы для даведкі: *морква, грушы, слівы, агуркі, яблыкі.*

**12.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Родзяць там
гарох, цыбуля,
кроп і морква
кожны год.
Гэта месца — а. . .

*У. Мацвеенка*

Запішыце ў сшытак адгадку і выпішыце назвы агародніны.

Дапішыце, што яшчэ расце ў вашым агародзе.



**Паразмаўляем**

**13.** Праслухайце верш.

Калі ласка, дзякуй,
добры дзень —
ветлівыя словы
чую ад людзей...

*Т. Кляшторная*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пакажыце ў парах, за што і як вы будзеце выказваць падзяку свайму сябру.

Узор.

1. — Калі ласка, дай мне паглядзець тваю кніжку!
— Вазьмі, паглядзі.
— Дзякуй. А ты паглядзі маю.
— Дзякуй табе.

2. — Пачастуйся цукеркамі.
— Дзякуй. Я люблю цукеркі.

**14.** Слухайце і паказвайце, як капаюць бульбу, зграбаюць лісце, саджаюць дрэўцы, збіраюць яблыкі.

Капаем бульбу.
Зграбаем лісце.
Саджаем дрэўцы.
Збіраем яблыкі.

У якую пару года выконваюць гэтыя дзеянні?

Запішыце ў сшытак назву пары года і дзеянні, якія паказвалі.

***15.** Разгледзьце малюнкі.







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце прыказкі.

1. Увосень за стол просім.
2. Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю.
3. У верасні адна ягада, ды і тая — горкая рабіна.

Падбярыце да малюнкаў прыказкі.

Якая прыказка вам больш спадабалася? Запішыце яе ў сшытак.

## *Урок 4*

**16.** Прачытайце. З кім сябруе дзяўчынка Дзіна?

Я сябрую з Зінай. Так завуць маю козачку. Яна вельмі прыгожая. Я люблю з ёю гуляць, бегаць. Я Зіну кармлю і ўмею яе даіць. Зіна частуе мяне смачным малаком.

*Дзіна Варапай*

Выпішыце ў сшытак па парадку сказы са словам *Зіна*.

**17.** Складзіце сказы і запішыце іх у сшытак. У канцы кожнага сказа стаўце кропку.

Узор. *Самалёт ляціць.*

| **Назвы прадметаў** | **Дзеянні прадметаў** |
|---|---|
| Самалёт | ляціць |
| Касілка | ідзе |
| Цягнік | плыве |
| Лодка | косіць |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***18.** Слухайце ўважліва. Гульня «Хто ляціць?». Калі прадмет ляціць, пляскайце ў далоні.

Качкі ляцяць.
Самалёты ляцяць.
Гусі ляцяць.
Рыбы ляцяць.
Камары ляцяць.
Пчолы ляцяць.
Стракозы ляцяць.
Дрэвы ляцяць.

Запішыце ў сшытак назвы прадметаў, якія ляцяць.

Узор. *Качкі ляцяць, ... .*

**19.** Прачытайце.

Людзі ездзяць
- на машыне
- на трамваі
- на аўтобусе
- на возе
- на тралейбусе
- на таксі
- на грузавіку
- на кані

Складзіце і запішыце ў сшытак два сказы (на выбар).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**20.** Прачытайце верш.

### Навошта хваляваццa!

— Куплю табе, унук, шакаладку,
ды нешта не бачу малюсенькіх...
— Вялікую з’ем для пачатку,
дарэмна, дзядуля, хвалюешся!

*Р. Барадулін*

Які ўнук: разумны, неразумны, знаходлівы, жартаўлівы?

## *Урок 5*

***21.** Прачытайце.

### Наш лес

Сёння цёплы восеньскі дзень. Дзеці ідуць у лес. У лесе дарослыя людзі збіраюць грыбы і ягады. Зараз дзеці ідуць у грыбы.

Адкажыце пісьмова на пытанні.
Які сёння дзень?
Куды ідуць дзеці?
Што дзеці будуць збіраць у лесе?
Што робяць у лесе дарослыя?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разгледзьце малюнкі. Якія грыбы вы пакладзяце ў свой кошык?



**22.** Праслухайце і адгадайце загадку.

***

Хто ён — гэты садавод?
Паліў сад і агарод.
Не шкадуючы вады,
вымыў дрэвы і кусты.
Ён і заўтра, як відаць,
будзе сад наш паліваць.

*А. Клышка*

Калі добра растуць дрэвы і кусты?

Чаго чакаюць людзі, калі засуха?

Складзіце і запішыце ў сшытак сказы пра тое, што зрабіў дождж.

**23.** Назавіце прадметы на малюнках і пакажыце, як імі працуюць.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Запішыце ў сшытак адказы на пытанні.

Малаток (што робіць?) ... .
Прас (што робіць?) ... .
Рыдлёўка (што робіць?) ... .
Піла (што робіць?) ... .

Узор. *Малаток прыбівае.*

Словы для даведкі: *прасуе, прыбівае, капае, пілуе.*

**24.** Складзіце сказы. Запішыце іх у сшытак.

Узор. *Каця прасуе сукенку.*

| | |
|---|---|
| Каця | прасуе сукенку. |
| Васіль | капае градку. |
| Мікола з Міхасём | пілуюць дровы. |
| Рыгор | збівае скрынку. |



## Паразмаўляем

**25.** Прачытайце. Пакажыце ў пары, як вы будзеце прасіць прабачэння.

Пеця сутыкнуўся з Віцем. Ён папрасіў прабачэння:
— Віця, прабач, калі ласка.
— Нічога, Пеця. У іншы раз будзь уважлівым.
— Я незнарок.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 6*

**26.** Прачытайце. Запішыце ў сшытак, як завуць кошку, кацяня, сабаку.

Узор. *Кошку завуць ... .*

У Алёнкі — кошка Дымка. У Антона — сабака Шарык. У Дымкі — кацяня Цімка. Алёнка бароніць Цімку ад Шарыка.

Ці ёсць у вас хатняя жывёла — кот ці сабака? Раскажыце пра яе.

***27.** Праслухайце.

У магазіне маці купіла хлеб, майку, каву, малако, шкарпэткі, кефір і сасіскі.

Маці папрасіла Віцю пакласці прадукты з сумкі ў халадзільнік.

Віця паклаў усё ў халадзільнік.

Чым вас здзівіў Віця? Як Віця зразумеў просьбу мамы?

Раскажыце, якую ежу вы будзеце браць з сумкі і раскладваць у халадзільніку. Якія рэчы вы пакладзяце ў шафу?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Хвілінка-весялінка

**28.** Праслухайце верш.

***

Пасярод дарогі
козлік бег бязрогі,
а сустрэў карову,
закрычаў сурова:
— Уцякай з дарогі —
падніму на рогі!

*І. Муравейка*

Што вы ў вершы знаходзіце смешным? Ці былі ў козліка рогі?

Які быў козлік? (Смелы, маленькі, бязрогі.)

Разыграйце сустрэчу козліка з каровай. Прыдумайце словы карове.

***29.** Прачытайце верш. Пакажыце птушку мухалоўку на малюнку.

### Мухалоўкі



Мухалоў
і мухалоўка
ловяць мух
і мошак лоўка.

Але самі
не ядуць —
да гняздзечак
іх нясуць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А ў гняздзечку —
пяць галовак.
Гэта —
дзецi мухаловак.

*А. Клышка*

Што робiць мухалоў? Што робiць мухалоўка? Пакажыце iх дзеяннi.

Запiшыце ў сшытак сказ пра мухалова i мухалоўку.

**30.** Пры дапамозе лiчылкi вызначце, хто пачне гульню. Яна называецца «Я ведаю пяць iмёнаў дзяцей на лiтары **Л** i **М**».

**Кацiлася торба**

Кацiлася торба
з вялiкага горба.
А ў той торбе
хлеб, паляніца.
З кiм ты хочаш
падзялiцца?

*В. Вiтка*

Называйце па ўзоры:

— Я ведаю пяць iмёнаў на лiтары **Л** i **М**:
Ларыса — раз, Макар — два, ... .

Запiшыце пяць iмёнаў у сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 7*

**31.** Прачытайце.

### Дзень нараджэння

Сёння дзень нараджэння ў Аленкі. Да яе прыйшлі госці. Яны павіншавалі Аленку з днём нараджэння. Аленцы спадабаліся падарункі.

Пакажыце, як дзеці віншуюць Аленку. І як Аленка ім дзякуе. Не забывайцеся ўсміхацца і глядзець у вочы адно аднаму.

Каго вы павіншуеце? Запішыце ў сшытак. Устаўце патрэбныя словы.

Я павіншую … . Я падару … .

 **Паразмаўляем**

**32.** Прачытайце. Пакажыце, як вы будзеце дапамагаць Машы. Якія словы ёй скажаце?

У клас прыйшла новая вучаніца Маша. Яна саромелася. Яе пасадзілі з Алесем за першую парту.

Вучні класа казалі Машы добрыя і ласкавыя словы:

— Ты прыгожая дзяўчынка. Ты нам вельмі падабаешся.

— Звяртайся да нас з просьбай. Мы табе дапаможам.

— Ты старанная.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Можна цябе абняць і ўзяць цябе за руку?

— У мяне два аднолькавыя алоўкі. Вазьмі адзін сабе.



## Хвілінка-весялінка

**33.** Прачытайце гутарку.

Унук просіць:
— Бабуля, пойдзем на рэчку.
— Няма настрою.
— Тады пойдзем у магазін і купім настрой.

*А. Ясючэня*

Што паляпшае ваш настрой?

**34.** Слухайце ўважліва. Гульня «Я ведаю кветкі».

Калі настаўнік будзе называць кветку, пляскайце ў далоні. Калі будзе называць іншае слова, стукайце далоняй па парце.

Рамонак.
Лілея.
Званочак.
Ружа.
Званок.
Цыбуля.
Бэз.

Запішыце ў сшытак назвы пяці кветак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***35.** Праслухайце верш.

### Журавінка

Журавінка, журавінка,
вузенькі лісточак,
у маленькай журавінкі
кветка, як званочак.
Вельмі любіць журавель
ягадкі-кіслінкі.
Ну, а мы з табой
кісель
зварым з журавінкі.

*А. Дзеружынскі*





Запішыце ў сшытак адказы на пытанні.

Дзе растуць журавіны? Якога яны колеру? Якія яны на смак?

Што гатуюць з гэтых ягад?

## *Урок 8*

**36.** Прачытайце. Расказвайце і паказвайце.

У Раі шмат спраў. Трэба паліць кветкі. Трэба пакарміць ката. Трэба посуд памыць. Трэба выцерці пыл.

Запішыце ў сшытак два сказы (на выбар).

Якія справы вы робіце дома?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**37.** Прачытайце верш з радасцю. Пакажыце, як вы весяліліся.

***

Гром грымеў,
мы лікавалі,
бо даўно дажджу чакалі...

*У. Мацвеенка*

**38.** Прачытайце прыказкі. Вывучыце на памяць прыказку, якая вам спадабалася.

1. Дождж ідзе — грыбы будуць.
2. Як сена косяць, то дажджоў не просяць.

Чаму не просяць дажджоў?
Пакажыце, як збіраюць грыбы, як косяць сена.
Запішыце прыказкі ў сшытак.

***39.** Прачытайце верш.

**Дружная сям'я**

Наша дружная сям'я:
мама, тата, Цімка, я.
Я хаджу вучыцца ў школу,
Цімка бегае вясёлы.
Ёсць яшчэ сабачка ў нас,
добры, ён не ўкусіць вас,
смела вы заходзьце ў дом,
дзе шчасліва мы жывём.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Будзем рады брат і я,
будзе рада ўся сям'я.

*Л. Міткевіч*

Колькі чалавек у сям'і хлопчыка?

Запішыце ў сшытак імя яго брацiка. Выпішыце сказ пра брацiка.

Як хлопчык запрашае прыйсці гасцей?

**40.** Гульня «Хлопчыкі — дзяўчынкі». Будзьце ўважлівымі! Станьце ў круг.

Калі вучань скажа «дзяўчынкі» — прысядаюць дзяўчынкі. Калі вучань скажа «хлопчыкі» — прысядаюць хлопчыкі. Тыя дзеці, што памыліліся, садзяцца за парты.

Наступны вучань ужывае іншыя пары слоў: «Брацікі — сястрычкі», «Сябры — сяброўкі».

Выйграе той, хто застанецца ў крузе апошнім.



## Хвілінка-весялінка

**41.** Настаўнік ці вучань чытае верш. Дзеці паказваюць.

### Вожык

Вожык
узяў кошык.
Маліны збіраў.
Сабе ў рот складаў.
Пусты кошык.
Таўсты вожык.

Чаму кошык пусты? Чаму вожык таўсты?

Адкажыце пісьмова: куды пайшоў вожык?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ТЭКСТ

## *Урок 9*

**42.** Прачытайце сказы ў правым слупку. Затым — у левым слупку. У якім слупку сказы звязаны па сэнсе?

Мяне завуць Аленка.
Гэта хлопчык Цішка.
Дзяўчынку завуць Юля.
Гэта пакой хлопчыка.
Мама чытае кнігу.

Гэта наша сям'я.
Мы жывём усе разам.
Мая мама і мой тата займаюць адзін пакой.
Мой маленькі брацік Цішка і я спім і гуляем у другім пакоі.
Трэці пакой займае мая старэйшая сястра Юля.

Разгледзьце малюнак. Пакажыце на малюнку маму, тату, Цішку, Аленку, Юлю.



Спішыце ў сшытак з тэксту правага слупка першыя два сказы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Тэкст** — гэта некалькі сказаў, якія звязаны паміж сабой па сэнсе.

*У нас ёсць сад. Там растуць яблыні і слівы. Мы любім свой сад.*

**43.** Прачытайце сказы.

1. Рому падарылі коціка. Коцік любіць мяса. Рома купіў коціку каўбасу.

2. Дзеці збіраюць грыбы. Званок кліча дзяцей на ўрок. У Волечкі брацік Антось. Хлопчыкі любяць гуляць у футбол.

Якія сказы складаюць тэкст? Запішыце іх у сшытак.

**44.** Называйце і паказвайце жэстамі дзьмухавец, рамонак, канюшыну, званочак. Вам дапамогуць малюнкі.









Запішыце ў сшытак назвы кветак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***45.** Прачытайце словы і злучэнні слоў у левым і правым слупках.

### Кветкі на лузе

| | |
|---|---|
| Галаву схілілі … . | дзьмухаўцы |
| Расцвілі … . | рамонкі |
| Распусцілі пух … . | званочкі |
| Чырванеюць кветкі … . | канюшыны |

Адкажыце на пытанні. 1. Якія кветкі галаву схілілі? 2. Якія кветкі распусцілі пух? 3. Якія кветкі чырванеюць?

Складзіце сказы і запішыце іх у сшытак.

Узор. *На лузе растуць кветкі.*

Ці атрымаўся ў вас тэкст? Аб чым гаворыцца ў тэксце?

Тэкст мае **тэму.** Тэма тэксту — гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце. Тэма тэксту часта перадаецца ў яго назве.



### Паразмаўляем

**46.** Раскажыце адно аднаму пра сваю сям’ю. Загінайце пальцы на руцэ. Пачынаем з вялікага пальца.

Гэты пальчык — татачка.
Гэты пальчык — мамачка.
Гэты пальчык — сястрычка. Завуць яе Волечка.
Гэты пальчык — мой браток. Завуць яго Юрачка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гэты пальчык — я. Вось і ўся мая сям'я. (Пальцы згінаюцца ў кулак.)

Колькі чалавек у вашай сям'і?

### *Урок 10*

**47.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву. Пра што гаворыцца ў тэксце?

Сёння субота. Уся сям'я дома. Мы дружна працуем разам.

Мама ... бялізну. Бабуля ... ежу. Тата ... дыван. Косцік ... абутак.

Спішыце тэкст у сшытак. Устаўце патрэбныя словы.

Словы для даведкі: *ваксуе, гатуе, чысціць, развешвае.*

**48.** Прачытайце верш.

**Ружы зацвілі**

Матылёчак пырхае,
пчолы загулі.
Мы глядзім, не дыхаем —
ружы зацвілі.

*Н. Галіноўская*

Што ўбачылі дзеці?

Чаму дзеці глядзелі на ружы і не дыхалі? Якімі былі ружы? Пакажыце, як вы будзеце захапляцца прыгожай кветкай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***49.** Прачытайце размову дзвюх дзяўчынак.





**Памочніца**

— Я сягоння маме дапамагала.
— Я таксама. А што ты рабіла?
— Посуд мыла.
— Я чаравікі ваксавала.
— Маміны?
— Не, свае.
— Хіба гэта дапамога маме? Ты ж сабе гэта рабіла.

*А. Буцень*

Прачытайце назву тэксту. Чаму ён так называецца? Пакажыце на малюнку дзяўчынку-памочніцу.

Раскажыце, як вы дапамагаеце сваёй маме. Пакажыце.

**50.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце яе ў сшытак.

У чырвоных ботах
ходзіць па балотах.
На аднойназе стаіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паўтарыце і пакажыце:

Пастаім і мы, як бусел.
На адной назе стаім.
На другой назе стаім.

**51.** Параўнайце напісанне літар **Б** і **В**. Запішыце літары і словы па ўзоры ў сшытак.

*Б Б В В Барыс – Васіль*

## *Урок 11*

***52.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце тэкст.



Сёння нядзеля. Уся сям'я ў зборы. Накрылі абедзенны стол. На стале стаяць талеркі. Каля іх паклалі лыжкі і відэльцы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Смачна есці, — кажа маці.

Складзіце па малюнку і запішыце ў сшытак два сказы, каб атрымаўся тэкст.

Узор. *У нядзелю ўся сям'я збіраецца разам. Для абеду накрылі стол.*

Пакажыце, як вы накрываеце стол.



## Паразмаўляем

**53.** Прачытайце тэкст.

Віця просіць Антона завастрыць аловак. Антон выконвае просьбу Віці. Антон аддае аловак Віцю. Віця дзякуе Антону.

Разыграйце сцэнку.
Спішыце апошнія два сказы ў сшытак.

**54.** Разгледзьце малюнак.



Адкажыце на пытанні.
Чаго хоча Мурка?
Што робіць Аленка?
Чым Аленка частуе Мурку?
Складзіце сказы па малюнку.
Запішыце ў сшытак тэкст «Аленка і Мурка».

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *кошка, малака, налівае малако, частуе малаком.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Хвілінка-весялінка

**55.** Праслухайце верш. Пакажыце, як несла венічак чарапаха.

### Чарапаха

Бегла ў лазню чарапаха.
Несла венічак пад пахай.
Бегла, бегла — ой, бяда!
Знікла ў бочцы ўся вада.

*П. Сушко*

Чаму чарапаха не паспела ў лазню?
З кім можна параўнаць чалавека, які марудзіць?

***56.** Пазнайце і назавіце на малюнках свойскіх жывёл па іх частках. Запішыце ў сшытак назвы жывёл.







Складзіце тэкст пра адну свойскую жывёлу.
1. Дзе жывёла жыве?
2. Што яна есць?
3. Што яна дае?

Словы для даведкі: *карова, свіння, курыца.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**57.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Усіх возіць, а сам пехатою ходзіць.

2. Ходзіць па двары. На нагах кіпцюры. Белае каменне нясе.

3. Усіх буджу, хоць без гадзінніка хаджу.

Напішыце з адным словам-адгадкай у сшытак два-тры сказы, каб у вас атрымаўся тэкст. Дайце яму назву.

Адгадкі: *курыца, певень, конь.*

## *Урок 12*

**58.** Слухайце верш і паказвайце, што робяць бабуліны рукі.

**Бабуліны рукі**

У бабулі Люды
рукі —
проста цуда!

Усё яны
ўмеюць,
усё яны
паспеюць.
І кароўку падаіць,
і ў печы прапаліць,
прапалоць ля хаты градкі,
даць паесці парасятку.









Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



І падлогу памыць,
і мяне пакарміць,
сваю ўнучку Машу,
смачнаю кашай.

*А. Бадак*

Складзіце тэкст па малюнках.
Што ўмеюць рабіць вашы рукі?

**59.** Назавіце прадметы на малюнках. Як іх можна назваць адным словам?



Запішыце ў сшытак, што стаіць у вашым пакоі.

У з о р. *У маім пакоі стаяць ..., ..., ... .*

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *крэсла, стол, шафа, канапа, этажэрка.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**60.** Прачытайце тэкст. Спішыце яго ў сшытак.

Я маю свой пакой. У ім я сплю, гуляю, займаюся. Я выціраю пыл у сваім пакоі, мыю падлогу і паліваю кветкі. У маім пакоі чыста і ўтульна.

Раскажыце пра свой пакой.



## Хвілінка-весялінка

**61.** Праслухайце верш.

### Босыя цукеркі

Здалёк
прыехала бабуля,
па Мінску пахадзіла.

Яна
для ўнучкі-капрызулі
«падушачак» купіла.

А ўнучка пазірае скоса:
— Я не хачу
цукерак босых!

*Р. Барадулін*

Чаму ўнучка названа капрызуляй? Што вы параіце дзяўчынцы?

Як вы сустрэлі б сваю бабулю? Што б вы ёй сказалі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***62.** Прачытайце.

Там бацькі і дзеці будуць збіраць грыбы. Сёння бацькі і дзеці гуляюць з мячом. У нядзелю яны паедуць у лес.

Перастаўце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Спішыце тэкст у сшытак.

## *Урок 13*

**63.** Прачытайце тэкст.

У Дзяніса дружная сям'я. Тата адвозіць дзяцей у школу. Мама забірае іх. А ўвечары сям'я разам гатуе вячэру.

Дайце назву тэксту. Назвы для выбару:
1. Дружная сям'я.
2. Тата, мама і дзеці.

Складзіце і запішыце ў сшытак тэкст «Мая сям'я» з двух-трох сказаў.



### Паразмаўляем

**64.** Выкажыце просьбу. Папрасіце ветліва прабачэння.

Узор. — Маленькая Любачка спіць. Калі ласка, не крычыце.

— Прабачце нам. Мы будзем ціха гуляць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***65.** Праслухайце тэкст.

Хлопчык захварэў. Да прыходу ўрача трэба пакласці яго ў ложак. Затым напаіць гарачым чаем з малінавым варэннем. Або можна даць цёплага малака з мёдам. Выклікаць урача.

Разгледзьце малюнкі. Каго вы бачыце на малюнках? Чаму ў хлопчыка завязана горла?





Прачытайце, што робіць старэйшая сястра да прыходу ўрача.

Сястра поіць хворага брата гарачым чаем з малінавым варэннем.

Запішыце ў сшытак сказ пра тое, як сястра даглядае хворага брата.

**66.** Адкажыце вусна, што лепш.

Быць здаровым ці хворым?
Быць сумным ці вясёлым?
Мець сябра ці не мець?
Спрачацца ці жыць у згодзе?

Запішыце ў сшытак адзін са сказаў па ўзоры.

У з о р. *Лепш быць здаровым.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**67.** Параўнайце напісанне літар **П п** і **Т т**. Лічыце і пішыце літары ў паветры. Запішыце літары і словы ў сшытак па ўзоры.

*Пп Тт* *Паша – Тоня*

## *Урок 14*

**68.** Прачытайце. Вызначце, гэта асобныя сказы ці тэкст.

Мама будзе варыць боршч. Дачка дапамагае маме. Яна абірае бульбу. Мама націрае буракі і моркву. Смачны будзе боршч.

Дайце назву тэксту.

Што вам болей падабаецца — боршч ці іншы суп? Чым яны адрозніваюцца?

Адкажыце на пытанні. Запішыце ў сшытак адказы.

Што робіць дачка?

Што робіць маці?

**69.** Запішыце ў сшытак словы ў дзве групы.

**Садавіна**: груша, ... , ..., ... .
**Агародніна**: памідор, ..., ..., ... .

Складзіце (вусна) па два-тры сказы пра садавіну ці пра агародніну, каб у вас атрымаўся тэкст.

Словы для даведкі: *яблык, сліва, агурок, морква, вішня, цыбуля*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***70.** Прачытайце тэкст.

### Яблык

Дзед купіў вялікі яблык. Ён аддаў яго ўнучцы Ніне. Прыйшла з работы мама. Ніна аддала яблык маме. Мама падзякавала Ніне і аддала яго маленькаму Міхаську.

Міхаська разрэзаў яблык на ... часткі. Смачны быў яблык.

*Паводле В. Хомчанкі*



Пакажыце, як вы раздзеліце яблык.
На колькі частак Міхаська разрэзаў яблык? Чаму?
Складзіце тэкст па малюнках. Запішыце яго ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**71.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Што на градзе з літараю ***р*** расце?

Запішыце два сказы пра агародніну (на выбар) у сшытак.

Словы для даведкі: *радыска, рэпа, рэдзька*.

**72.** Прачытайце верш.

***

Плача Коця на кухні,
ад слёз вочы папухлі...
— Як мне жыць у хаце,
калі хлусіць Каця?
Смятану злізала —
на мяне сказала.

*В. Вітка*

Чаму плача коцік? Хто злізаў смятану?
Які гэта ўчынак: добры ці дрэнны?
Што б вы параілі Каці?

## *Урок 15*

***73.** Прачытайце.

Сям'я пераехала ў новую кватэру. Тата нёс ... . Маці несла ... . Дачка Рая несла ... . Бабуля несла ... .

Напішыце тэкст «Навасёлы» ў сшытак.

Словы для даведкі: *крэсла, чамадан, клетка, вазон, папугай.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**74.** Вы згубілі ручку. Спытайце пра яе ў суседа па парце.

У з о р.
— Я згубіў ручку. Антось, ты яе не бачыў?
— Вось твая ручка.
— Вялікі дзякуй.
— Калі ласка.

**75.** Прачытайце верш.

***

— Хто цябе пакрыўдзіў,
дарагі сынок?
— А мяне
ўчора
штурхануў Змітрок.
— Што ж ты сёння плачаш,
ды на ўсё сяло?
— А цябе ўчора
дома не было...

*І. Муравейка*

Чаму плакаў хлопчык? Хто яго пакрыўдзіў?
Чаго хацеў хлопчык?
Пакажыце, як будзеце суцяшаць маленькае дзіця. (Пагладжу па галаве, вытру слёзы, абдыму і прытулю да сябе.)



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**76.** Прачытайце. Перастаўце сказы, каб атрымаўся тэкст. Запішыце яго ў сшытак.

Мы частавалі вожыка малаком. У лесе жыў вожык. Ён часта прыходзіў у сад.

**77.** Параўнайце напісанне літар **Л л** і **М м.** Чым яны падобныя і чым адрозніваюцца? Колькі элементаў у літары **Л**? Колькі элементаў у літары **М**? Пішыце і лічыце. Запішыце літары і словы ў сшытак па ўзоры.

*Лл Мм* *Ліда – Маруся*

## *Урок 16*

**78.** Прачытайце тэкст. Кім хоча стаць Косцік?

Косцік — мой старэйшы брат. Ён хоча стаць футбалістам. Для гэтага трэба быць дужым і вынослівым.

Раніцай Косцік робіць зарадку. Ён ходзіць плаваць. Наведвае спартыўную секцыю па футболе.

Якім трэба быць футбалісту?
Што робіць Косцік?
Запішыце другую частку тэксту ў сшытак.

**79.** Прачытайце тэкст. Разгледзьце малюнак.

### Белавежская пушча

У Белавежскай пушчы жывуць розныя звяры. Дзеці едуць паглядзець на зубра.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Які зубр па велічыні і сіле? (Моцны, малы, дужы, вялікі.) Запішыце тэкст у сшытак.

**80.** Прачытайце верш. Назавіце словы з гукам ***ж***.





Кажуць вожыку стрыжы:
— Нас пад вожыка стрыжы.
— Падстрыгу, як змагу,
я ж стрыжоў не стрыгу.

*Н. Сторажава*

Выпішыце ў сшытак словы з літарай ***ж***.

Разгледзьце малюнкі. Пакажыце сароку. Якія ў яе бакі? Пакажыце стрыжа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**81.** Разыграйце размову ў пары.

Саша спытаўся ў повара:
— Ганна Міхайлаўна, што будзе сёння на абед?
— Суп, грэцкая каша з катлетай і кампот.
— Дзякуй.
— Калі ласка.

***82.** Прачытайце верш.

***

А чаго ж я вам жадаю?
Зараз, зараз прыгадаю...
Каб бадзёрымі былі вы,
каб разумнымі раслі вы,
каб былі здаровы самі,
каб былі здаровы мамы.

*К. Крапіва*

Што аўтар жадае дзецям і мамам?
Як вы дапамагаеце маме ў хатніх справах?
Назавіце свае абавязкі ў сям'і. Пакажыце дзеянні.
Запішыце вашы абавязкі ў сшытак.

*Прыкладныя абавязкі.*

1. Выціраю пыл. 2. Паліваю кветкі. 3. Збіраю посуд са стала. 4. Мыю посуд. 5. Складаю кніжкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 17*

***83.** Прачытайце сказы. Перастаўце іх так, каб атрымаўся тэкст.

Усе п'юць чай з мёдам. Сёння нядзеля. Яна выбрала свежы мёд. Цётка Ганна чакае гасцей. Уся сям'я ідзе да цёткі Ганны.

Запішыце тэкст у сшытак.

 **Паразмаўляем**

**84.** Разыграйце сцэнку «Пасварыліся і памірыліся». Пакажыце, як вы будзеце мірыцца і прасіць прабачэння.

— Прабач, Слаўка, твая праўда.
— Прабачаю.
— Не крыўдуй на мяне. Давай мірыцца.
— Я не крыўдую. Давай сябраваць.

**85.** Дапоўніце сказы словамі, каб атрымаўся тэкст. Вам дапамогуць пытанні і словы для даведкі. Запішыце тэкст у сшытак.

Дзеці ў лесе знайшлі (каго?) … . Прынеслі яго (куды?) у … . Тупацеў (хто?) … цэлую ноч. Празвалі яго (як?) … . Адпусцілі вожыка потым (куды?) у … .

*Паводле Я. Брыля*

Словы для даведкі: *вожыка, хату, вожык, Тупцік, лес.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**86.** Прачытайце верш.





## Вочкі

Сіненькія вочкі
ў маленькай дочкі.
Кажуць вочкам матылькі:
— Вы не вочкі — васількі,
а можа, званочкі?
— Не, мы — вочкі, вочкі!

*Н. Тулупава*



Якога колеру вочкі ў дзяўчынкі?
Да якіх кветак яны падобныя?
Пакажыце васількі і званочкі.
Чым яны падобныя, а чым адрозніваюцца?
Як яшчэ называюць кветкі васількі?
Прачытайце з дапамогай люстэрка: васількі, валошкі.



## Хвілінка-весялінка

**87.** Прачытайце верш Н. Галіноўскай.

## Памыў пінжачок

Жук пытаецца ў жука:
— Ты чаму без пінжака?
— Я памыў свой пінжачок
і павесіў на сучок.

Пакажыце, як вы вешаеце пінжак у шафу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 18*

***88.** Праслухайце тэкст.

### Бабуліна хустачка

Бабуля была хворая. Яе кармілі з лыжачкі. Бабулю наведала дачка. Было холадна, а дачка была без шапкі. Бабуля зняла сваю хустачку і дала дачцэ.

Бабуля памерла. Хустачка цяпер самая дарагая рэч у сям'і.



Якой была бабуля? Хто яе наведаў?

Чаму яна аддала хустачку дачцэ?

Чаму сям'я беражэ хустачку?

Запішыце ў сшытак, якая дарагая рэч ёсць у вашай сям'і.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**89.** Прачытайце тэкст.

Тата Стасіка працуе на заводзе. Мама працуе ў сталоўцы. Стасік вучыцца ў школе.

Хлопчык сам робіць урокі. Ён дапамагае маме па гаспадарцы. Мама мые посуд. Стасік ставіць талеркі і кубкі ў шафу.

Дзе працуе тата Стасіка?
Дзе працуе мама Стасіка?
Што робіць Стасік?
Як хлопчык дапамагае маме?

Дайце назву тэксту (на выбар): «Памочнік», «Тата, мама і сын».

Запішыце ў сшытак першыя тры сказы тэксту.

**90.** Прачытайце верш.

**Пчала**

Каля саду на градзе
пчолка рупная гудзе.
Рана дзень яе пачаўся,
каб ты мёдам частаваўся.

*Л. Шырын*

Якая пчала?
Чаму дзень пчолкі пачынаецца рана?
Як працуе руплівы чалавек? (Старанна, клапатліва.)

Складзіце і запішыце ў сшытак сказ пра руплівых пчолак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**91.** Прачытайце тэкст.

На сняданак мама зварыла аўсянку. Міхась любіць гэтую кашу.

На талерцы перад ім ляжаць булкі і хлеб. На сподачках масла і сыр. У кубку чай. Хлопчык снедае і дзякуе маме.

Што вам гатуюць на сняданак?
Пакажыце, як вы намазваеце масла на булку ці хлеб.
Пакажыце, як вы снедаеце і дзякуеце.
Запішыце ў сшытак, што вы сёння елі на сняданак.



## Хвілінка-весялінка

**92.** Прачытайце верш.

**Ці лілі**

— Ці лілі алей у рэдзьку,
ці лілі?
— Ты не цілілікай, Федзька,—
сам налі.

*В. Вітка*

Што параілі зрабіць Федзьку самому?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СКАЗ

## *Урок 19*

**93.** Прачытайце верш.

***

Напісала Люся
ліст сваёй бабусі.
І кладзе ў паперку
смачную цукерку.
— Будзе яна чытаць
і лядзянчык мой смактаць.

*Л. Мароз*

Пра што гаворыцца ў першым сказе? У другім сказе?

Для чаго Люся кладзе цукерку? Што яна гаворыць пры гэтым? Як дзяўчынка адносіцца да сваёй бабусі?

Прачытайце апошні сказ. Перадайце любоў дзяўчынкі да бабусі.

Чым вы радуеце сваіх блізкіх?

Спішыце два першыя сказы ў сшытак.

Усе словы ў сказе звязаны паміж сабой па сэнсе. *Людзі радуюцца сонцу.*

**94.** Прачытайце тэкст. Запішыце ў сшытак апошнія два сказы.

**З сябрам працаваць весялей**

Аднаго разу дзядуля папрасіў мяне скласці пакалатыя дровы. Мой сябар пачаў дапамагаць мне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Удвух мы хутка склалі дровы. З сябрам працаваць весялей.

*У. Статкевіч*

Раскажыце, як вы дапамагаеце сваім сябрам.

**95.** Прачытайце тэкст. Адкажыце вусна на пытанні.

Гэта было ў час вайны. Карнікі схапілі лесніка Пахома. Яны збілі яго і замкнулі ў хляве. Сабака лесніка Ворчык падгробся пад сцяну і выратаваў Пахома.

*Паводле Б. Сачанкі*

Калі гэта адбывалася?
Што зрабілі карнікі?
Хто выратаваў Пахома?
Запішыце тэкст у сшытак.

**96.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце і запішыце ў сшытак сказы па малюнках.





Словы для даведкі: *хлопчыкі, дрэўцы, садзіць; дзяўчынка, куры, карміць.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**97.** Праслухайце верш. Чаму Ясь пачаў лепш вучыцца?

— Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца
і як след за кнігі ўзяўся.
— Дык ты ведаеш, бабуля, —
тэлевізар сапсаваўся.

*А. Дзеружынскі*

А вам тэлевізар дапамагае ці перашкаджае вучыцца?

***Урок 20***

**98.** Прачытайце тэкст.

Восенню шмат клопатаў на агародзе. Выспелі ягады чорнай рабіны. Разам з сястрой мы хутка нарвалі цэлае вядро.

*Паводле У. Статкевіча*

Колькі ў тэксце сказаў? Колькі слоў у першым сказе? Спішыце два сказы ў сшытак.



## Паразмаўляем

**99.** Раскажыце пра сябе ў пары.

Узор.
— Дзе ты жывеш?
— Я жыву ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— З кім ты сябруеш?
— Я сябрую з ... .
— Які твой любімы занятак?
— Я люблю ... .

Запішыце пісьмовыя адказы на пытанні ў сшытак.

**100.** Падлічыцеся, хто будзе першы загадваць загадкі.

**Лічылка**

Ехаў Пеўнік
з базару.
Вёз дадому
воз тавару.
Тым, каго ён
сустракаў,
падарункі
раздаваў.
Глянуў дома — воз пусты.
Выйшлі ўсе, застаўся ты!

*М. Пазнякоў*

1. Не брэша, не кусае, а ў хату не пускае.
2. Чатыры браты пад адным дахам жывуць.
3. Рук і ног не мае, а вароты адчыняе.

Запішыце другую загадку разам з адгадкай у сшытак.

Адгадкі: *вецер, стол, замок.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**101.** Прачытайце верш. Колькі ў ім сказаў?

**Вожык**

Цягне вожык
лісця возік.

Мосціць вожык
з лісця ложак.

*П. Сушко*

Параўнайце словы *возік* і *вожык*.

Якімі гукамі і літарамі гэтыя словы адрозніваюцца?

Колькі слоў у апошнім сказе? Запішыце гэты сказ у сшытак.

**102.** Вызначце парадак напісання літар. Запішыце ў сшытак літары па ўзоры.

*З ж Ж з* *Жз – зж*

## *Урок 21*

***103.** Разгледзьце малюнкі.


Віця


Алеся


Ніна


Сцёпа



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пакажыце куртку, плашч, касцюм, сукенку.
Прачытайце подпісы.
Дапішыце сказы.
1. У Віці … . 2. У Алесі … . 3. У Ніны … . 4. У Сцёпы … .

Словы для даведкі: *сукенка, касцюм, куртка, плашч.*



## Паразмаўляем

**104.** Разыграйце размову ў пары.

Маці папрасіла:
— Сярожачка, прынясі, калі ласка, маю сумку з пярэдняга пакоя.
— Якую сумку?
— Зялёную.
— Мама, вазьмі сумку, калі ласка.
— Дзякую.

**105.** Прачытайце тэкст.

У школу я хаджу з дзядулем. Я старанна вучуся. Дома мяне чакаюць мае сябры — кот і сабака.

Колькі ў тэксце сказаў?
Адкажыце пісьмова на пытанні.
З кім хлопчык ходзіць у школу?
Як ён вучыцца?
Хто чакае хлопчыка дома?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**106.** Праслухайце.

Петрык хадзіў з бабуляй у цырк.
— Табе спадабалася ў цырку? — пацікавілася мама.
— Так, вельмі спадабалася, — адказаў Петрык.
— А што табе спадабалася больш за ўсё?
— Марожанае.

Хлопчык жартаваў ці адказваў сур’ёзна?

**107.** Праслухайце і адгадайце загадку.

***

Пахне лісцем і грыбамі.
Пахне бульбаю, імхамі.
Пахне дымам, пахне потам.
Пахне полем і работай.
І, напэўна, кожны знае:
гэта ... бывае.

*Т. Шылько*

Чаму восень пахне лісцем і грыбамі?
Чаму яна пахне бульбай і потам?

Запішыце сказы ў сшытак. Устаўце прапушчаныя словы.

Людзі восенню капаюць ... .
Восень пахне ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 22*

**108.** Разгледзьце малюнкі.








Чым можна парадаваць маму ці тату ў дзень нараджэння? Зрабіце малюнак ці асенні букет з лісця. Якімі словамі вы павіншуеце маму ці тату?

У з о р. ... ...! *Я віншую цябе і жадаю* ... .

**109.** Прачытайце сказы. Колькі слоў у першым і апошнім сказах?

Дрэвы надзелі свой восеньскі ўбор. Ярка гараць гронкі рабін. Дзеці зрабілі букеты з лісця.

Спішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце першыя літары ў першых словах сказаў.

Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставіцца кропка. *Пятрусь прыгожа спявае.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**110.** Спішыце тэкст у сшытак. Дапішыце першыя літары ў словах. Падкрэсліце гэтыя літары. Прачытайце тэкст.

..аш клас дружны. ..ера добра спявае. ..іша добра малюе.





***111.** Прачытайце і адгадайце загадку.



Расце на тонкай ножцы.
Твар да сонейка падобны.



Складзіце і запішыце ў сшытак сказ са словам *сланечнік*. Падкрэсліце першую літару ў сказе.

Што атрымліваюць са сланечніка?

Пакажыце сланечнік, як паказвае хлопчык.

Словы для выбару: *семачкі, ягады, арэхі, алей.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**112.** Праслухайце верш.

### Заяц

У чырвоны колер
зайца
маляваў Ігнатка.

— Зай чырвоны
не бывае, —
супярэчыць Натка.

Хлопчык глянуў на сястру
і крыху сумеўся,
ды знайшоўся:
— Гэты зай
моркаўкай аб’еўся.

*А. Дзяржынскі*

Як зайчыка называюць Натка і Ігнатка?
Якога колеру бывае заяц зімой? Якога — летам? Чаму?

### *Урок 23*

**113.** Прачытайце сказы. Пра што гаворыцца ў сказах?

Хлынуў дождж. Мы хутка ўцякалі. Хмарка нас дагнала.

Спішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце першую літару ў кожным сказе. У канцы сказаў стаўце кропку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вучымся чытаць з правільнай інтанацыяй.

Пры вымаўленні некаторых сказаў голас можа спачатку павышацца, а пад канец сказа паніжацца. Тады ў канцы сказа ставіцца кропка.

*Ціхая ноч лягла на зямлю.*

*Усе людзі ляглі спаць.*

**114.** Прачытайце сказы. У канцы кожнага сказа пляскайце ў далоні.

Узор. *Пайшоў дождж.* |__________ __________ .

Надышла хмара. Пайшоў дождж. Людзі раскрылі парасоны.

Запішыце сказы ў сшытак.
Зрабіце схемы да сказаў па ўзоры.

**115.** Прачытайце сказы. Дапоўніце іх словамі.

Дзяўчынка рыхтуе ... .
Маці варыць ... .
Косцік палівае ... .

Колькі слоў у кожным сказе?
Спішыце сказы ў сшытак. Устаўце словы.
Зрабіце схему аднаго сказа.

Словы для даведкі: *суп, урокі, кветкі.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**116.** Пакажыце ў пары, як вы будзеце знаёміцца і расказваць пра сябе.

Узор.
— Як цябе завуць?
— Сцяпан. А цябе?
— А мяне — Захар.
— У якім класе ты вучышся?
— Я вучуся ў трэцім класе. А гэта мой сябар Тарас.
— Вельмі прыемна.

Не забывайце падысці блізка, гаварыць з усмешкай, глядзець у вочы.

**117.** Прачытайце сказы.

Паўлінка збірае ягады.
Сымонка складае дровы.

Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце першую літару ў кожным сказе.
Зрабіце схему аднаго сказа.

### *Урок 24*

**118.** Прачытайце пытанні і адказы.

— Куды ты ідзеш?
— Да сябра.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Як завуць твайго сябра?
— Ясь.

Спішыце ў сшытак сказы з пытальнікам у канцы. Падкрэсліце пытальнікі.

Вучымся чытаць з правільнай інтанацыяй.

У сказах, дзе аб нечым пытаюцца, у канцы ставіцца пытальнік. Пры вымаўленні такіх сказаў голас у канцы іх павышаецца.

— *Якое тваё імя́?*
— *Маё імя Маруся.*

**119.** Прачытайце сказы.

1. Што ў Даніка? — У Даніка мяч.
2. Што любіць хлопчык? — Хлопчык любіць гуляць у футбол.
3. Кім будзе Данік? — Данік будзе футбалістам.

Спішыце трэцяе пытанне і адказ у сшытак. Стаўце патрэбныя знакі прыпынку.

Зрабіце схему першага сказа.

**120.** Прачытайце сказы.

Дзяцел дзяўбе.
Шчупак плавае.
Дзік бегае.
Заяц дрыжыць.

Зрабіце схему аднаго са сказаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разгледзьце малюнкі. Паказвайце і называйце жывёл на іх.






Пакажыце дзеянні кожнай жывёлы.

Спішыце сказы ў сшытак. Не забывайцеся ставіць кропкі ў канцы сказаў.

*121. Гульня «Умею — не ўмею». Праслухайце.

І спытаў дзед унука:

— Што ўмеюць твае рукі?

Антонік змоўк, задумаўся, пасур’ёзнеў ураз і даў такі адказ:

— Умею есці апельсіны.

— Не ўмею купляць іх у магазіне.

— Умею ў халадзільнік лазіць.

— Не ўмею з сястрычкай ладзіць.

— Умею талеркі мыць.

— Не ўмею гузіка прышыць...

Слухаў дзед ды ўсміхаўся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Хвалю, Антонік, ты стараўся! Што ўмееш — проста цуд. Вельмі радуе мяне, што няўмельствы ведаеш свае.

*Паводле У. Ліпскага*

За што дзед пахваліў унука?

Што ўмеюць рабіць вашы рукі? Запішыце адказ у сшытак.

**122.** Запішыце ў сшытак адказы на пытанні. Выкарыстоўвайце малюнкі.

Што нёс Апанас? — Апанас нёс ... . 

Што елі Тарас і Барыска? — Тарас і Барыска елі ... . 

Хто стаяў на прыпынку? — На прыпынку стаяла ... . 

*Урок 25*

***123.** Праслухайце верш. Прачытайце па чарзе сказы верша.

**Хто асінку напалохаў?**

Хто асінку напалохаў?
Што так лісцейка дрыжыць?
Можа, заяц дзе паблізу?
Можа, воўк пад ёй ляжыць?
Ці лісы яна чакае?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ці мядзведзя чуе крок?
То па лесе несціхана
ходзіць вецер-летунок.

*П. Пранузa*

Хто напалохаў асінку? Запішыце адказ у сшытак.

**124.** Разгледзьце малюнкі. Запішыце адказы на пытанні ў сшытак.

  

Якая салата па колеры? — ... .
Якая цыбуля на смак? — ... .
Які кабачок па велічыні? — ... .

Словы для даведкі: *вялікі, зялёная, маленькая, горкая.*



## Паразмаўляем

**125.** Прачытайце размову. Спішыце сказы ў сшытак. Пастаўце ў канцы іх знакі прыпынку. Падкрэсліце ў сказах пытальнікі.

— Дзе ты быў у суботу
— У бабулі
— Чым яна цябе частавала



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Пірагамі
— З чым былі пірагі
— З ягадамі
— З якімі
— Клубніцамі (чарніцамі)

Разыграйце размову ў пары.

**126.** Прачытайце.

**Хто як працуе?**
Шафёр.
Цырульнік.
Піяніст.

Пакажыце іх дзеянні.
Адкажыце на пытанне.

Словы і злучэнне слоў для даведкі: *стрыжэ, водзіць машыны, іграе.*

**127.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні. Кожны сказ дапоўніце словам.

Слаўка падае́ дзядулю (ш т о?) ... .
Бацька купіў сыну (ш т о?) ... .
Па вуліцы едзе (ш т о?) ... .

Запішыце адказы на пытанні ў сшытак.

Словы для даведкі: *мяч, акуляры, аўтобус.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 26*

**128.** Прачытайце і адгадайце загадку. Пакажыце на малюнку дзюбу, ногі. З чым параўноўваюцца ногі? З чым параўноўваецца дзюба? Пакажыце рукой вострую дзюбу і пляскатую.

**Хто есць рогам?**

Важна ходзіць каля хаты,
мае ногі, як лапаты.
На дзяцей глядзіць яна строга,
есць траву пляскатым рогам.
— Хто адкажа? Ты, Кастусь?
— Той ядок — наша шэрая ... .

*Р. Ціханава*



***129.** Прачытайце словы. Адкажыце на пытанні. У якім слупку названы фрукты і ягады? У якім — агароднiна?

| | |
|---|---|
| яблыкі | буракі |
| грушы | морква |
| слівы | радыска |
| вішні | гарох |
| апельсіны | капуста |
| парэчкі | агуркі |
| агрэст | памідоры |
| маліны | часнок |
| клубніцы | цыбуля |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дапоўніце сказы.

Яблыкі, грушы, ..., ..., ... — гэта фрукты.
Буракі, морква, ..., ..., ... — гэта агародніна.

**130.** Прачытайце сказы. Спішыце іх у сшытак.

*Што мые Света? Света мые садавіну. Яна частуе яблыкамі дзядулю.*

 **Хвілінка-весялінка**

**131.** Праслухайце тэкст.

— Ты памыў рукі? — спытала маці ў сына.
— Памыў. Калі не верыш, зірні на ручнік, — сказаў Рома.

Як вы думаеце, якім стаў ручнік?
Пакажыце, як вы мыеце рукі. Што трэба рабіць, каб ручнік заставаўся чыстым?

*Урок 27*

**132.** Выканайце даручэнні. Адкажыце на пытанні.

— Пакладзі, калі ласка, сшытак на стол. Ш т о т ы р о б і ш? — Я кладу сшытак.
— Пастаў вазон на акно. Ш т о т ы р о б і ш? — Я стаўлю вазон.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Я хачу паглядзець твой падручнік. Што ты робіш? — Я даю свой падручнік.

Спішыце ў сшытак спачатку сказ, у якім выказваецца просьба, потым сказ, у якім выказваецца пажаданне, затым сказ, у якім ёсць загад.

Вучымся чытаць з правільнай інтанацыяй.

У некаторых сказах выказваецца просьба, пажаданне, загад. *Вася, прынясі, калі ласка, кнігу.*

У сказах могуць перадавацца розныя пачуцці: радасць, здзіўленне, захапленне і іншыя. У канцы такіх сказаў ставіцца клічнік. *Якая ў цябе прыгожая сукенка! Не адставайце, сябры!*

**133.** Выразна прачытайце сказы.

Які цікавы быў хакей ( ) Ты любіш хакей ( ) Уступай у нашу каманду хакеістаў ( ) Так добра хакеісты гулялі ( ) Я радаваўся нашай перамозе ( )

Спішыце ў сшытак сказы ў наступным парадку. Спачатку сказ, у якім задаецца пытанне. Потым сказ, у якім выказваецца просьба. Затым сказы, у якіх перадаюцца розныя пачуцці. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы сказаў.

Пакажыце, як гуляюць у хакей.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**134.** Прачытайце верш.

### Тэлевізар

Вас цікавіць
навіна?
— Вось яна!

Вы чакалі
казку?
— Калі ласка!

Трэба вам
кіно?
— Вось яно!..

Усё раскажа
і пакажа, —
мы сябруем з ім даўно.

*В. Жуковіч*



Чаму дзеці даўно сябруюць з тэлевізарам?

Прачытайце верш яшчэ раз. Адзін чытае пытанне, другі — адказ, трэці — апошні сказ з кропкай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**135.** Разгледзьце малюнак.



Прачытайце, што гавораць дзеці. Адгадайце і пакажыце на малюнку, хто з іх Галя, а хто — Маня.

Мама: Сёння на снеданне пярловая каша.

Галя: Сёння на снеданне пярловая каша! Мне вельмі падабаецца пярловая каша з малаком!

Маня: Сёння на снеданне пярловая каша! Я не люблю пярловую кашу з малаком!

Прачытайце сказы спачатку з пачуццём радасці, потым — з незадаволенасцю.

***136.** Праслухайце тэкст. Адгадайце, паміж кім ідзе гаворка.

**Два спевакі**

— ..., што ты ўсё спяваеш і спяваеш? На світанні спяваеш, днём спяваеш і нават ноччу спяваеш!

— Гэта я, ..., не спяваю. Я яшчэ толькі вучуся спяваць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Вучышся, ...? Ах ты няўмека! А я ўжо даўно навучылася. Вось паслухай, як я прыгожа спяваю: кар-кар-кар!

*С. Іваноў*

Прачытайце па ролях: адзін вучань за салаўя, другі — за варону.

Які салавей? Якая варона?

Выберыце для іх патрэбныя словы з дадзеных.

Працавіты (працавітая), старанны (старанная), гультаяваты (гультаяватая), сціплы (сціплая), ганарлівы (ганарлівая).

Запішыце ў сшытак, якая варона і які салавей.

Словы для даведкі: *варона, салавей*.

## *Урок 28*

**137.** Прачытайце тэкст.

Вам чыталі цудоўныя казкі і вершы Карнея Іванавіча Чукоўскага. Ведаеце, якое любімае слова было ў пісьменніка? Слова РАДАСЦЬ.

Чукоўскі вельмі любіў дзяцей і пісаў для іх радасныя вершы.

*В. Грандава*

Прыдумайце і запішыце ў сшытак сказ са словам «радасць» або «радасны».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**138.** Прачытайце верш з пачуццём радасці.

***

Рады, рады, рады
светлыя бярозы,
і на іх ад радасці
вырастаюць ружы!

Рады, рады, рады
цёмныя асіны,
і на іх ад радасці
растуць апельсіны!

*К. Чукоўскі*

Спішыце адзін слупок верша (на выбар) у сшытак. Чаго ў прыродзе не бывае?



## Паразмаўляем

**139.** Разгледзьце малюнак.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце, што Алена гаворыць сваім сябрам.

Алена: Прыходзьце, калі ласка, да мяне ў нядзелю на дзень нараджэння.

Алесь: Вялікі дзякуй, Алена, прыйду абавязкова.

Таццяна: Дзякуй за запрашэнне, але я паеду з бацькамі ў нядзелю да бабулі. Яна таксама нарадзілася ў гэты дзень. Вельмі шкада, што не змагу прыйсці да цябе!

Юля: Прыйду абавязкова! А хто яшчэ будзе?

Якое пытанне не трэба задаваць?

**140.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце верш з пачуццём радасці.



**Незабудкі**

Незабудкі мае, незабудкі,
колькі радасці светлай ад вас!
Я хачу, каб ніколі, ніколі
ні адзін ваш агеньчык не згас!

*Н. Галіноўская*

Дапішыце сказы.

Якія прыгожыя ... ! Я віншую цябе са ... ! Дзякуй за ... !

Калі вершык спадабаўся, вывучыце яго на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***141.** Разгледзьце напісанне літар **З** і **Е**. Абвядзіце пальцамі літару **З**. Яна «пазірае» ўлева. Пакажыце, куды «глядзіць» літара **Е**. Запішыце літары і словы ў сшытак па ўзоры.

*З – Е Е – З* *Зоя – Ева*

## *Урок 29*

**142.** Праслухайце тэкст.

Маці паслала Цімку купіць батон. Каля дзвярэй магазіна Цімка штурхануў дзядулю і прабег уперад. Дзядуля лёгенька стукнуў Цімку кійком па спіне. Хлопчык азірнуўся: за што? Дзядуля з хітрынкай у вачах моўчкі пайшоў да прылаўка.

Дома Цімка расказаў маці пра дзядулю.

Маці сказала:

— Сорамна! Ты пакрыўдзіў старога чалавека! Ты павінен быў прапусціць дзядулю першым. Трэба старэйшых людзей паважаць!

*Паводле П. Кавалёва*

Што адбылося каля дзвярэй магазіна?
Што сказала маці сыну? Прачытайце.
Каго пакрыўдзіў Цімка?
Спішыце апошні сказ у сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**143.** Прачытайце.

Васіль абедае, кацяня пішчыць.

Васіль: Мама, кацяня мяўкае! Яно, можа, хоча есці?

Мама: Вазьмі малако з халадзільніка і налі ў спадачак.

Пакажыце, як вы будзеце адкрываць пакет з малаком і наліваць малако ў спадачак.

Апішыце свае дзеянні. Устаўце патрэбныя словы.

Я адкрываю … . Я наліваю … ў спадачак. Я кармлю свайго … .

**144.** Прачытайце тэкст.

### Калінавая рукавічка

Каля дарогі расла каліна. На ёй раслі чырвоныя ягадкі. Маленькі хлопчык збіраў іх у рукавічку. Ягадкі каліны будуць лячыць маму.

*Паводле А. Васілевіч*

Адкажыце на пытанні.

Што расло каля дарогі?

Што збіраў хлопчык у рукавічку?

Для каго хлопчык збіраў ягады?

Чаму тэкст так называецца?

Запішыце тэкст у сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

***145.** Праслухайце верш.

### Пакланіся добрым людзям

Век дзяліся тым, што маеш, —
хлебам-соллю, казкай-краскай.
Ну, а ў госці запрашаеш,
гавары ўсім:
— Калі ласка!
А з табой як тое будзе,
то за шчодры знак усякі
пакланіся добрым людзям
і скажы ім шчыра:
— Дзякуй!

*У. Паўлаў*

Разыграйце сітуацыі: запрасіце госця за стол; падзякуйце за пачастунак.

Госцю кажуць:

— Калі ласка! Запрашаем вас за стол. Смачна есці! Хлеб ды соль!

Госць у канцы дзякуе за пачастунак:

— Дзякую за пачастунак! Вялікі вам дзякуй!

Пакажыце ў пары, як вы будзеце запрашаць госця; дзякаваць за пачастунак.

Спішыце ў сшытак словы, якія кажуць госцю.

Запішыце словы падзякі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**146.** Прачытайце. Чаму стогне парсючок? Што яму параіў пеўнік?

### Хворы парсючок

Стогне ля карыта
парсючок Мікіта.
Кажа пеўнік Зух:
— Больш не еш за двух!

*В. Трусевіч*

## *Урок 30*

**147.** Складзіце сказы і запішыце іх у сшытак.

1. На, сядзелі, дрэве, птушкі. 2. Катаецца, на, Вова, санках. 3. У, карпа, злавіў, рацэ, тата. 4. Дзеці, футбол, гулялі, ў.

**148.** Да прыведзеных слоў падбярыце словы-дзеянні. Складзіце сказы.

1. Трактарыст
   Птушка → што робіць?
   Сонца
2. Настаўнікі
   Вучні → што робяць?
   Машыны

Запішыце ў сшытак па два сказы з розных груп.

Словы для даведкі: *свеціць, лятае, арэ; чытаюць, пішуць, едуць.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***149.** Прачытайце. Складзіце і запішыце ў сшытак сказы з назвамі вучэбных рэчаў.

Рукзак, падручнік, сшытак, пенал, аловак.

**150.** Складзіце са слоў сказы.

1. Дарогу, хлопчык, бабулі, перайсці, дапамог. 2. Да, прыйшлі, сябры, яго, брата. 3. Падарыла, Галіна, сяброўцы, альбом.

Пакажыце, як вы дапамагаеце старэнькім бабулям ці дзядулям пераходзіць вуліцу.



## Хвілінка-весялінка

**151.** Праслухайце.

Бабуля праводзіць унучку ў школу і гаворыць ёй:
— Глядзі, унучка, каб рукі былі чыстыя.
— Дык мне сёння не трэба пісаць і маляваць?

Чаму ў дзяўчынкі былі брудныя рукі?

## *Урок 31*

**152.** Палічыце, колькі слоў у кожным сказе. Запішыце ў сшытак сказы, у якіх па два словы.

1. Хлопчыкі майструюць.
2. Мама прасуе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Макар малюе.
4. Васіліна палівае кветкі.

Зрабіце схему сказа з трох слоў.

***153.** Складзіце сказы і запішыце ў сшытак.

У, дзеці, лес, зімовы, прыйшлі. У, мароз, лясы, колер, белы, пафарбаваў. Стаяць, сасна, і, прыгожыя, елка. На, снегавыя, ляжаць, галінках, шапкі, дрэў. На, звяроў, і, сцежках, сляды, птушак.

Вызначце тэму тэксту. Дайце яму загаловак.

**154.** Прачытайце і адгадайце загадку.

***

...Дыхнуў ён на воды —
масты і масточкі стварыў.
Каткі і каточкі
скаваў ён за ночку
і дзецям усё падарыў.

*В. Жуковіч*

Складзіце і запішыце ў сшытак сказ пра мароз.

Словы для выбару: *будаўнік, мастак, мароз.*

**155.** Спішыце сказы ў сшытак. Устаўце словы, якія падыходзяць па сэнсе.

Кошка злавіла (к а г о?) ... .
Птушка звіла (ш т о?) ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Садоўнік пасадзіў (ш т о?) ... .
Дзеці праспявалі (ш т о?) ... .

Зрабіце схему аднаго сказа (на выбар).

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *песню, гняздо, мышку, сліву.*



**Хвілінка-весялінка**

**156.** Прачытайце тэкст.

**Падзяліся**

— Падзяліся з брацікам, — кажа мама Каці.
— Падзялюся. Я Валерку ад цукеркі дам паперку.

*В. Трусевіч*

Што б вы сказалі Каці?
Як вы дзеліцеся цукеркамі са сваімі брацікамі і сястрычкамі?

## *Урок 32*

**157.** Прачытайце. Устаўце словы па сэнсе.

Бабуля атрымала падарунак (а д  к а г о?) ад ... .
Вучні задалі пытанне (к а м у?) ... .
Дрэвы ў лесе пакрыты (ч ы м?) ... .

Спішыце сказы ў сшытак.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *снегам, настаўніцы, сына.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**158.** Разгледзьце малюнак. Адкажыце пісьмова на пытанні.



Да каго прыйшоў Сеня?

Што ён прынёс? Пра каго ён прачытаў? Якая была кніжка?

Спалучэнні слоў для даведкі: *пра касманаўтаў, да сябра, вельмі цікавая кніга.*

**159.** Прачытайце тэкст. Спішыце ў сшытак апошнія два сказы.

У лесе расце прыгожая елка. На ёй вісяць шышкі. На елцы сядзіць дзяцел. Пад елкай хаваецца баязлівы заяц.

**160.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Матылі насіліся,
над зямлёй кружыліся.
А як долу ўпалі —
белым пухам сталі.

*Н. Парукаў*

Складзіце і запішыце ў сшытак сказ са словам-адгадкай.

Адгадка: *сняжынкі.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**161.** Пакажыце і назавіце кветкі на малюнках.












Пакажыце і назавіце на рамонку часткі кветкі.

Складзіце і запішыце ў сшытак тры сказы з назвамі тых кветак, якія вам падабаюцца.

Узор. *У садзе растуць прыгожыя ... .*
*Я падарыў сястры букет ... .*
*У жыце растуць сінія ... .*

Якія кветкі вы дорыце сваёй маме?

Словы для даведкі: *ландыш, ружы, званочкі, валошкі, рамонкі.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 33*

**162.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце сказы па малюнках і пытаннях. Запішыце іх у сшытак.

Што робіць — будаўнік? / сталяр? / швачка?

Пакажыце дзеянні людзей гэтых прафесій.







**163.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім сказаў?

### Тузік

У Зоі — сабака Тузік. Зоя дае сабаку косткі. Тузік грызе косткі.

Як завуць сабаку?
Што дае Зоя Тузіку?
Што робіць Тузік?

Запішыце тэкст у сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**164.** Прачытайце сказы. Замяніце малюнкі словамі.

Зоя вяжа .

Шура прымае .

Клава вышывае .

Запішыце сказы ў сшытак.

**165.** Прачытайце сказы. У канцы кожнага сказа пляскайце ў далоні.

Зіма Свеціць сонейка Дзеці гуляюць на вуліцы ў снежкі

Пакажыце, як гуляюць у снежкі.

Спішыце сказы ў сшытак. Пастаўце ў канцы кожнага сказа кропку.

**166.** Развучыце скорагаворку з суседам па парце. Раскажыце скорагаворку адзін аднаму.

**Скорагаворка**

Паклікаў Рыгорка  
Ягорку на горку,  
добра з Рыгоркам  
на горцы Ягорку.

*М. Пазнякоў*

Раскажыце, як вы катаецеся з горкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 34*

**167.** Складзіце па малюнках сказы. Адкажыце на пытанні.





1. Што робіць птушка? 2. Што адбываецца на вуліцы? 3. Што робіць повар?

Сказы для праверкі: *Ідзе снег. Повар гатуе ежу. Птушка спявае.*

**168.** Прачытайце і спішыце тэкст у сшытак.

Кот Фелікс сустрэў вожыка. Ён дакрануўся да яго і ўкалоў лапу. Феліксу было балюча.

**169.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Хвост увесь на двары,
толькі нос у нары.
І да той да пары,
пакуль нос у нары,
у дом не можа ўвайсці
ні малы, ні стары.

Пакажыце, як вы адчыняеце і зачыняеце замок. Як носяць ключ?

Адгадка: *ключ.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***170.** Прачытайце прыказкі. Устаўце патрэбныя словы. Пра якую пару года гаворыцца ў сказах?

1. Снежань год канчае, а зіму ... . 2. Студзень — году пачатак, а зіме ... . 3. Пытаецца люты, ці добра ... .

Спішыце ў сшытак прыказкі, устаўляючы патрэбныя словы. Падкрэсліце назвы месяцаў.

Словы для даведкі: *палавіна, пачынае, абуты.*

**171.** Параўнайце напісанне літар **К** і **Н**. Запішыце літары і словы ў сшытак па ўзоры.

*К – Н  Н – К  Кастусь – Навум*

*Урок 35*

**172.** Прачытайце сказы. Пакажыце, на якім малюнку Алеся, а на якім — Сеня.

Алеся есць суп. У Сені санкі.





Запішыце ў сшытак сказы з імёнамі вучняў вашага класа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**173.** Прачытайце сказы. Устаўце ў сказы прапушчаныя словы. Запішыце сказы ў сшытак.

Прыйшла ... зіма. Закружыла ... завіруха. Накрыла зямлю ... коўдрай.

Пакажыце, як кружыцца завіруха і як накрываюць коўдрай.

Словы для даведкі: *моцная, халодная, белай.*

***174.** Прачытайце сказы. Запішыце ў сшытак сказы па парадку, каб атрымаўся тэкст. Дайце яму загаловак.

Яны ўбачылі на дрэве вавёрку. Дзеці прыйшлі ў зімовы лес. Вавёрка скакала з дрэва на дрэва. Паляўнічы паказаў ім дарогу. Дзеці бегалі за вавёркай і заблудзіліся.

**175.** Прачытайце тэкст. Раскажыце, дзе хто спіць. Запішыце ў сшытак першы і апошні сказы тэксту.

Птушкі спяць на дрэвах. Качкі і гусі могуць спаць на вадзе. Чайкі спяць нават у палёце. Чалавек спіць на ложку.



**Хвілінка-весялінка**

**176.** Прачытайце верш.

**Зловім карася**

Ладжу звечара вудзільна,
стаўлю звечара будзільнік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мне сказаў сусед Рыгорка,
што карась клюе на золку.
Кажа, зловім карася,
карася — як парася!

*А. Пісьмянкоў*

Калі клюе карась? Скажыце інакш.

Якога карася спадзяецца злавіць Рыгорка? Пакажыце.

## *Урок 36*

**177.** Прачытайце верш. Чаму мы павінны шанаваць і любіць матуліны рукі?

***

Матуліны рукі
нас песцяць, галубяць.
Так шчыра, як маці,
ніхто нас не любіць.

Матуліны рукі —
адзіныя ў свеце.
Шануйце, любіце
заўсёды іх, дзеці!

*В. Вярба*

Спішыце ў сшытак першы сказ верша.

Напішыце, што робіць мама для сваіх дзяцей. Што робіць ваша мама для вас?

Узор. *Мама гатуе ежу, ... .*

Спалучэнні слоў для даведкі: *ходзіць у магазін; гатуе ежу; купляе прадукты, адзенне; мые бялізну; прыбірае ў кватэры; даглядае хворага.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**178.** Прачытайце ласкавыя словы.

Мамачка, матулька, матулечка.
Татачка, татулька, татулечка.
Бабуля, бабулька, бабулечка.
Дзядуля, дзядулька, дзядулечка.

Напішыце ліст або запіску, дзе выкарыстайце ласкавыя словы.

Узор. *Мамачка, матулечка, я пайшоў да сябра. Яго нумар тэлефона ... .*

*Саша*

***179.** Прачытайце тэкст. Дабаўце ў сказы патрэбныя словы.

**Мядовік**

Мы любім ... і ... ... . Наша мама пячэ ... . У хаце цудоўна пахне ... . Мы будзем піць чай з маміным ... .

Запішыце тэкст у сшытак.

Словы для даведкі: *мёд, мядовыя пернікі, мядовік, мёдам, мядовікам.*

**180.** Прачытайце тэкст.

Вася — вучань 3 класа. Хлопчык ахвотна ходзіць у школу. У класе ў Васі многа сяброў.

Выкарыстайце тэкст, каб расказаць пра сябе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У з о р. — *Я вучань ... ... .*
— *Я вучаніца ... ... .*

Запішыце ў сшытак тэкст аб сабе. Напішыце імёны сваіх сяброў.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *я, хаджу, сяброў, у мяне, сяброваак.*



**Хвілінка-весялінка**

**181.** Прачытайце верш.

**Шчыры адказ**

— Ты зрабіў, сынок, урокі? —
запытала маці ў Воўкі.
— Так, зрабіў, бо ўчора тата
прыляцеў з камандзіроўкі.

*П. Прануза*

Хто робіць урокі: Воўка ці тата?

Вы самі робіце ўрокі ці вам хтосьці дапамагае? Хто вам дапамагае і як?

## *Урок 37*

**182.** Прачытайце тэкст. Што звычайна ядуць на снеданне? Абед? Вячэру? Устаўце патрэбныя словы.

Мы ядзім для нашага здароўя. Ежа дапамагае нам расці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мы ядзім тры-чатыры разы ў дзень.

На снеданне дзеці ядуць ..., п’юць ... ці ... .

Абед — асноўны прыём ежы. Мы ядзім першую, другую і трэцюю стравы. На першае — ..., на другое — ..., на трэцяе — ... . На вячэру — ... і ... .

Напішыце ў сшытак адказ на адно пытанне.

Узор. *На снеданне дзеці ядуць кашу, п’юць малако ці чай.*

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *суп, катлету ці мяса з гарнірам; піцво (кампот, сок, каву ці чай); кашу, малако ці чай; кашу і кефір.*

**183.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце, як карыстаюцца сталовымі прыборамі. Калі не ўмееце, навучыцеся.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

За ядой мы карыстаемся наступнымі прыборамі: ..., ..., ... .

Посуд — гэта кубак, ... .

Словы для даведкі: *лыжкай, кубкам, шклянкай, відэльцам, нажом, чайнікам, талеркай, сподачкам.*

***184.** Прачытайце правілы паводзін за ядой. Запішыце ў сшытак гэтыя правілы. Так вы іх хутчэй запомніце.

Непрыгожа сёрбаць суп.
Непрыгожа набіраць ежы поўны рот.
Нельга размаўляць, круціцца за сталом.
Нельга чытаць.
Нельга класці локці на стол.
Нельга рукі выціраць аб адзенне. Трэба выціраць сурвэткай.

Вывучыце гэтыя правілы і выконвайце іх.

 **Хвілінка-весялінка**

**185.** Праслухайце верш.

**Смяшынка**

Што за весялушка
гэтая Ірынка!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

І чаго смяецца
за сталом дзяўчынка?
— Сціхні ты, дачушка, —
просіць Іру тата.
А яна смяецца
звонка, на ўсю хату.
Весела зірнула
бабка на Ірынку:
— Праглыні, унучка,
ты сваю смяшынку.

*А. Дзяружынскі*

Чаму нельга размаўляць і смяяцца за ядой?

**186.** Параўнайце напісанне літар **А** і **Л.** Чым яны адрозніваюцца? Запішыце ў сшытак літары і словы па ўзоры.

*А – Л Л – А   Алеся – Ліда*

## *Урок 38*

**187.** Разгледзьце малюнак. Раскажыце, што вы на ім бачыце. Вам дапамогуць пытанні.

Свеціць якое сонца?
Над чым лятаюць птушкі?
Хто плыве ў лодцы?
Чым вяслуе дарослы?
Што робяць хлопчыкі на беразе возера?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Складзіце і запішыце ў сшытак пры дапамозе малюнка і пытанняў тры сказы.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *па возеры, яркае, над возерам, у лодцы, ловяць рыбу, хлопчыкі, хлопчык і дзяўчынка, дарослы, вёсламі.*

**188.** Прачытайце, устаўляючы патрэбныя словы. Вызначце тэму тэксту.

**Возера Нарач**

У нашай краіне многа рэк і азёр. Самае цудоўнае возера — Нарач. Возера Нарач вельмі вялікае. Яго называюць беларускім морам.

Вада ў возеры ... . У возеры водзіцца шмат рознай ... . Па возеры плаваюць прыгожыя ... . Растуць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

вакол возера вялікія ... . У лясах шмат ... і ... . На возеры адпачываюць ... і ... .

Спішыце ў сшытак другую частку тэксту. Устаўце патрэбныя словы.

Словы для даведкі: *рыбы, грыбоў, ягад, лясы, дарослыя, дзеці, празрыстая, лебедзі.*

***189.** Праслухайце верш.

**Радзіма**



Люблю цябе, мая старонка.
Люблю вясновы пах раллі.
Люблю лугі твае ў рамонках
і ў жытнім золаце палі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Люблю вясёлы шчэбет птушак.
Люблю свой гарадок і дом.
Вясёлку — сем дзівосных стужак
у небе, вымытым дажджом.

Люблю цябе, мая старонка,
у вянку бярозак і дубоў —
і кожны дзень спяваю звонка
пра гэту вечную любоў.

*Ю. Нядзведзь*

Адкажыце пісьмова.
Што аўтар любіць у сваёй Радзіме?
Аб чым ён спявае кожны дзень?

Узор. *Люблю лугі твае ў рамонках, ... .*

**190.** Адкажыце на пытанні пісьмова.

Як называецца наша Радзіма?
Як называецца галоўны горад нашай краіны — наша сталіца?
Якія вуліцы ў сталіцы?
Што ўпрыгожвае вуліцы нашай сталіцы?

Праверце, як вы выканалі заданне.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *Мінск, Беларусь, шырокія і вузкія, зялёныя дрэвы.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**191.** Прачытайце верш. Разгледзьце малюнак. Пакажыце скрынку, пакажыце мех з крупамі.



**Ехаў зайка**

Ехаў зайка з рынку.
Вёз цукерак скрынку.
Ліс за возам туп-туп.
Нёс паўпуда круп, круп.

*Д. Бічэль*

! **Пуд** — гэта крыху больш за 16 кілаграмаў. Паўпуда — крыху больш за 8 кілаграмаў.

Як вы думаеце, лёгка лісу несці паўпуда круп ці цяжка? Пакажыце дзеянні зайкі і ліса.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СЛОВА

## Слова — назва прадмета

*Урок 39*

***192.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце сказы і ўстаўце ў іх патрэбныя словы.



1. ... палівае кветкі. 2. ... з ... ходзіць па двары. 3. ... расце каля хаты. 4. Пад дрэвам стаіць ... . 5. На стале стаяць ... і ... з ... . 6. За плотам ходзіць ... .

Спішыце ў сшытак сказы. Устаўце прапушчаныя словы. Нумары сказаў не ўжывайце.

Словы і спалучэнні слоў для даведкі: *курыца з куранятамі, стол, дзяўчынка, чайнік і спадачкі з кубкамі, конь, дрэва.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**193.** Прачытайце, устаўляючы ў сказы словы.

Лясныя ... ратуюцца ад сваіх ворагаў па-рознаму.
... выратоўваюць хуткія ногі.
Спрытная ... ўцякае па дрэвах.
... ахоўваюць калючкі.
... дапамагае яе хітраватасць.

Словы для даведкі: *лісіцы, вожыка, вавёрка, звяры, зайца.*

**194.** Разгледзьце малюнак. Прачытайце тэкст. Устаўце ў сказы патрэбныя словы.



Кураня вылупілася з ... . Яго прыйшлі павіншаваць розныя ... . Карова прынесла ... . Сабака ў зубах



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

прынёс ... . Заяц прынёс смачную ... . Вожык на спіне прынёс ... .

Спішыце тэкст у сшытак. Устаўце патрэбныя словы.

Словы для даведкі: *жывёлы, яйка, кветку, моркву, яблык, костачку.*



**Хвілінка-весялінка**

**195.** Праслухайце верш.

**На кірмаш**

*(Жарт)*

Ліска едзе на кірмаш.
Неблагі вязе багаж:
за курачку дасць сарафан,
за пеўніка — кафтан.
За качку і гуску
дасць лісіца хустку.
Ну, а за паўліна —
мяккую пярыну.
— А што за індычку?
— Модную спаднічку.

*Паводле Н. Галіноўскай*

Што хоча атрымаць ліска на кірмашы?

! **Неблагі́** — добры.
**Кірма́ш** — базар.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**196.** Прачытайце. Адкажыце на пытанні. Выберыце тыя словы, якія вам больш падабаюцца.

Узор. *Працуе будаўнік.*

1. Хто працуе? (Брат, будаўнік, урач.) Працуе ... .
2. Што працуе? (Станок, машына, завод, магазін.) Працуе ... .
3. Хто расце? (Дзяўчынка, хлопчык, кацяня, сабачка.) Расце ... .
4. Што расце? (Дрэва, лес, сад, бульба.) Расце ... .
5. Хто плыве? (Мужчына, рыба, дэльфін.) Плыве ... .
6. Што плыве? (Лодка, карабель, дошка.) Плыве ... .

Спішыце ў сшытак сказы пад нумарамі 3 і 4.

## *Урок 40*

**197.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што вы на іх бачыце.







Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

 

Запішыце ў сшытак, устаўляючы патрэбныя словы.

Людзі (х т о?): хлопчык, ... .
Жывёлы (х т о?): сабачка, ... .
Расліны (ш т о?): дрэва, ... .

Словы — назвы прадметаў адказваюць на пытанні х т о? або ш т о?

Словы — назвы **людзей** і **жывёл** адказваюць на пытанне х т о? *Маці, ластаўка.*

Назвы **іншых, нежывых прадметаў** адказваюць на пытанне ш т о? *Яблык, агурок.*

**198.** Чытайце і стаўце да слоў пытанні х т о? або ш т о?

Настаўніца, вучань, падручнік, дзяўчынка, лінейка, сшытак.

Выпішыце ў сшытак спачатку словы, якія адказваюць на пытанне х т о?, потым — ш т о?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**199.** Разгледзьце малюнак. Назавіце прадметы на малюнку.



Запішыце ў сшытак словы, якія называюць прадметы, у два слупкі.

| Хто? | Што? |
| --- | --- |
| *хлопчык* | *кніга* |
| ... | ... |

Словы для даведкі: *канапа, кніга, стол, талерка, яблыкі, грушы; кот, сабака, хлопчык.*

**200.** Прачытайце тэкст.

**Вавёрка**

Клопатна было вавёрцы ўвосень. Яна скакала з дрэва на дрэва. На зіму вавёрка збірала арэхі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

і грыбы. Мароз не страшны вавёрцы. Яна добра падрыхтавалася да зімы.

Як вавёрка рыхтавалася да зімы? Адкажыце на пытанне пісьмова. Падкрэсліце адной лініяй слова, якое адказвае на пытанне к т о?



## Хвілінка-весялінка

**201.** Прачытайце верш.

### Крот

*(Скорагаворка)*

Хадзіў **певень** па надворку
і знайшоў скорагаворку:
падрыў крот
крывы плот,
рые норку
ў агарод.
Трэба пастрашыць недарэку:
— Ку-ка-рэ-ку! Ку-ка-рэ-ку!
Затаіўся ў норцы крот —
як зямлі набраў у рот.

*В. Вітка*

Хто хадзіў па надворку? Пра каго ён знайшоў скорагаворку?

Выпішыце ў сшытак словы — назвы жывёл. Пастаўце да слоў пытанні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 41*

***202.** Разгледзьце дзяўчынку.
Раскажыце пра яе па пытаннях.



Каго вы бачыце на малюнку?
Што апранула дзяўчынка?
Што ў дзяўчынкі на галаве?
Што ў яе на нагах?
Прачытайце і спішыце тэкст у сшытак.
Устаўце прапушчаныя словы.

Дзяўчынку завуць Марына.
Яна вучыцца ў трэцім класе. Марына апранула (ш т о?) ... . На галаве ў яе (ш т о?) ... . На нагах у яе (ш т о?) ... .

Словы для даведкі: *сукенку, бант, туфлі.*

**203.** Уважліва праслухайце словы. Калі слова абазначае жывёлу ці чалавека, падыміце правую руку, калі слова абазначае іншыя прадметы — левую руку.

Бабуля, цыбуля, вожык, ножык, вяроўка, вавёрка, Янка, ямка, цукерка, паперка, Валерка, талерка.

**204.** Прачытайце тэкст. Вызначце тэму тэксту.

Зіма намяла ў лесе гурбы снегу. Зайчыку цяжка скакаць. Вавёрка сядзіць у дупле. Высуне мордач-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ку, паглядзіць і зноў схаваецца. Лушчыць вавёрка арэшак. Есць яна сушаныя грыбочкі.

Што зіма намяла ў лесе?
Каму цяжка скакаць?
Хто схаваўся ў дупле?
Што лушчыць вавёрка?
Што яна есць?
Запішыце ў сшытак адказы на апошнія два пытанні.

**205.** Выпішыце ў сшытак словы па ўзоры.

| Узор. | Хто? | Што? |
|---|---|---|
| | *ластаўка* | *ружа* |

Ластаўка, ружа, верабей, рамонак, сініца, ландыш, голуб, лілея.

**206.** Параўнайце напісанне літар **Л — М — Ш**. Лічыце і пішыце іх спачатку на парце пальцам. Сусед па парце назірае і спрабуе зразумець, што вы пішаце. Затым памяняйцеся ролямі. Ён піша на парце, а вы сочыце.

*Л – М – Ш*   *Лёня – Мікіта – Шура*

Запішыце гэтыя літары і словы ў сшытак па ўзоры.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 42*

**207.** Дапішыце сказы.

Ляжыць на стале (ш т о?) … *(кніга)*. Стаіць на акне (ш т о?) … *(вазон)*. Падпісвае паштоўку (х т о?) … *(хлопчык)*. Сядзіць на ложку (х т о?) … *(бабуля)*.

**208.** Прачытайце.

Нож, ліпа, лыжка, елка, хлопчык, бабуля, тапо-ля, ёлка, хлеб, дуб.

Выпішыце ў сшытак словы — назвы дрэў.
Чым адрозніваецца елка ад ёлкі?

! **Ёлка** — упрыгожаная навагодняя яліна; **е́лка** — хваёвае дрэва ў лесе.

**209.** Прачытайце і прадоўжыце сказы.

Я пайду ў душ. Я вазьму … .
Я пайду гуляць. Я вазьму … .
Я буду шыць. Я вазьму … .
Бабуля дрэнна бачыць. Яна возьме … .

Запішыце ў сшытак два сказы на выбар.

Словы для даведкі: *ручнік, іголку з ніткай, акуляры, скакалку.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**210.** Прачытайце. Пакажыце на малюнках спаднічку, сукенкі, кашулю, шкарпэткі. Запішыце гэтыя словы ў сшытак.

Узор. *Адзенне — гэта кашуля, ... .*

Матуля купіла
мне кашулю.



Для сястры Аленкі
пашыла дзве сукенкі.



Маленькія дзеткі
надзелі шкарпэткі.



У маёй сястрычкі
новая спаднічка.

*Т. Шылько*



***211.** Прачытайце словы. Выпішыце ў сшытак назвы звяроў і што яны ядуць.

Узор. *Мядзведзь — мёд.*

Мядзведзь, капуста, мёд, заяц, кот, вавёрка, арэхі, малако.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 43*

**212.** Змяніце словы па ўзоры.

| Адзін (адна) | | Многа |
|---|---|---|
| *сад* | — | *сады* |
| шафа | — | ... |
| агарод | — | ... |
| яблык | — | ... |
| самалёт | — | ... |
| веласіпед | — | ... |

Словы — назвы прадметаў могуць абазначаць адзін прадмет і многа прадметаў.

*Стол — сталы, кніга — кнігі.*

**213.** Запішыце сказы ў сшытак. Змяніце словы па ўзоры.

1. Па небе плыла (хмара). — Па небе плылі *хмары*.
2. Цацку ўзяла (дзяўчынка). — ... .
3. Каля хаты пасадзілі (дрэўца). — ... .
4. На стале ляжала (кніжка). — ... .

***214.** Прачытайце. Замест кропак падбярыце патрэбныя па сэнсе словы. Запішыце ў сшытак тры сказы (на выбар).

1. ... працуе ў полі.
2. ... працуюць у полі.
3. Па моры плывуць ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Па моры плыве … .
5. За партамі сядзяць … .
6. Каля дошкі адказвае … .

Словы для даведкі: *трактар, трактары, карабель, караблі, вучань, вучні.*

**215.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце і назавіце часткі дрэў. Што расце на галінцы дуба? Што — на галінцы сасны? Пакажыце ствол і галінку.






Складзіце сказы па малюнках. Запішыце іх у сшытак. Падкрэсліце слова, якое абазначае многа прадметаў.

Узор. *Гэта галінка сасны. На ёй шышкі.*

Словы для даведкі: *жалуды, галінка, ствол, сцябло, шышкі.*

**216.** Пагуляем у гульню «Адзін — многа». Калі называецца адзін прадмет, пляскайце ў далоні адзін раз. Калі некалькі прадметаў, пляскайце некалькі разоў.

Кошка, кацяняты, кураняты, курыца, качаняты, гусяняты, качка, гуска.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 44*

**217.** Прачытайце. Замяніце выдзеленыя словы адным словам. Запішыце ў сшытак сказы з новымі словамі.

1. Увосень дзеці збіралі (ш т о?) **лісічкі, баравікі, сыраежкі.**
2. Унукі падарылі бабулі (ш т о?) **ружы, астры, нарцысы.**
3. У лесе жывуць (х т о?) **ваўкі, мядзведзі, ласі.**

**218.** Прачытайце верш. Разгледзьце малюнкі. Што робяць гэтымі прадметамі? Пакажыце.





****

Добра, што ёсць на свеце
**камень, гліна** і **пясок.**
Добра, што ёсць на свеце
**абцугі, цвікі** і **малаток.**

*С. Маршак*



Запішыце ў сшытак выдзеленыя ў вершы словы ў два слупкі.

| **Адзін** | **Многа** |
|---|---|
| *камень* | *цвікі* |

Запішыце ў кожны слупок свае два-тры словы. Гэта назвы прылад. Імі стрыгуць, пілуюць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**219.** Прачытайце. Дапоўніце сказы. Пакажыце размову ў пары.

— Васіль, схадзі, калі ласка, у магазін.
— Добра. Што трэба купіць?
— У нас скончыўся хлеб.
— А яшчэ што?
— Купі, калі ласка, ..., ..., ..., ..., ... .
— Можна мне купіць яшчэ ...?
— Можна. Вазьмі грошы.

Словы для даведкі: *цукар, малако, масла, цукеркі, тварог, марожанае.*

***220.** Спішыце ў сшытак. Словы ў дужках змяніце.

Узор. *Пісаць лісты, ... .*

Пісаць (ліст), чытаць (кніга), рашаць (задача), маляваць (карціна), саджаць (дрэва), карміць (курыца).

Словы для даведкі: *кнігі, задачы, лісты, карціны, курэй, дрэвы.*

**221.** Спішыце тэкст у сшытак. Словы ў дужках змяніце.

Узор. *Бярозка — бярозкі.*

Каля школы растуць (бярозка). Летам на дрэвах крычаць (грак). Увосень (птушка) сціхаюць. Паміж



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дрэвамі відаць вузкія (сцяжынка). Па іх (вучань) ходзяць у школу.

## *Урок 45*

**222.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце словы пад малюнкамі. Як адным словам можна назваць гэтыя прадметы?



Воўк



Ваўчок



Пірамідка



Машынка



Лялька



Мяч

Запішыце сказ у сшытак. Устаўце патрэбныя словы.

Мяч, ..., ..., ..., ..., ... — гэта ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**223.** Прачытайце верш з радасцю.

***

У Дзяніса сёння свята —
цацак дзед прынёс багата.
Рад Дзяніска, вельмі рад,
ён паставіў цацкі ў рад.

*А. Ставер*

Чаму ў Дзяніскі сёння свята?

Для чаго Дзяніска паставіў цацкі ў рад?

Ці прыносіў хто-небудзь вам адразу многа цацак? Калі гэта было? Як вы радаваліся?

***224.** Запішыце ў сшытак спачатку словы — назвы птушак, што зімуюць у Беларусі, затым — назвы пералётных птушак.

Верабей, ластаўка, бусел, сініца, грак, голуб.

Узор. *Птушкі, што зімуюць:* (хто?) *верабей, ...* , ... . *Пералётныя птушкі:* (хто?) *ластаўка, ...* , ... .

***225.** Прачытайце і адгадайце загадку.

***

У кватэры
ўпрыгожу
і падлогу,
і сцяну.

*М. Пазнякоў*

Складзіце і запішыце ў сшытак сказ са словам-адгадкай.

Адгадка: *дыван.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разгледзьце беларускія арнаменты.

Намалюйце дома беларускі арнамент на аркушы паперы.

**226.** Разгледзьце малюнкі. Кожны прадмет пакажыце жэстамі і рухамі.








Выберыце прадметы мэблі і запішыце іх назвы.

У з о р. *Мэбля — гэта стол, ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 46*

*227. Прачытайце словы. Выпішыце ў сшытак спачатку назвы адзення для зімы, потым — для лета.

**Адзенне**

| **Што для лета?** | | **Што для зімы?** |
|---|---|---|
| паліто | сукенка | футра |
| спадніца | шкарпэткі | хустка |
| шорты | панчохі | пінжак |
| кашуля | блузка | штаны |
| світар | камізэлька | шапка |
| фартух | шалік | капялюш |

Адкажыце пісьмова на пытанні.
Што адзяваюць?
Што апранаюць?

! Адзяваюць шкарпэткі, сукенку, спадніцу.
Апранаюць вопратку — верхняе адзенне: паліто, футра, плашч.

228. Навучыцеся з суседам па парце хутка чытаць скорагаворку. Прачытайце адзін аднаму.

**Капялюш**

Лепш не кратай, лепш не руш
мой дзіравы капялюш.
Падабаецца — надзень,
але толькі на дзень.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Раз надзень, два надзень,
куды хочаш, туды дзень.

*В. Вітка*

! **Не кра́тай** — не чапай, не дакранайся.

**229.** Разгледзьце малюнкі. Адкажыце адным словам, што вы бачыце на малюнку.

**Абутак**



Боцікі



Сандалі



Паўчаравікі



Басаножкі



Валёнкі



Туфлі



Пантофлі



Чаравікі

Напішыце ў сшытак, што вы абуваеце летам, што — увосень, што — зімой.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У з о р. *Летам я абуваю ... .*

Спішыце сказ у сшытак. Дапоўніце яго патрэбнымі словамі.

Басаножкі, боцікі, туфлі, ..., ... — гэта ... .

**230.** Разгледзьце малюнкі.

**Ягады**



Маліны



Чарніцы



Брусніцы



Буякі



Суніцы



Ажыны



Агрэст



Вінаград



Клубніцы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прачытайце тэкст.

Мяне завуць Алена. Я прыехала да бабулі ў вёску. Бабуля навучыла мяне старанна збіраць ягады. Мы збіралі з бабуляй ягады: ..., ..., ..., ... і ... .

Спішыце ў сшытак апошні сказ тэксту. Упішыце, якія ягады збірала дзяўчынка з бабуляй у лесе.

**231.** Прачытайце верш.

**Як хто зімуе?**

Заяц шэры, заяц-зух,
да зімы пашыў кажух.
Белы-белы зайка ў ім,
не пазнаць цяпер зусім.
Але зайку не сядзіцца:
мерзнуць вушы, лапкі.
Шые заяц рукавіцы,
шые заяц шапку.

*І. Бурсаў*

**Слоўнік**

**За́яц-зух** — *тут*: бойкі, уда́лы.

Пра каго гаворыцца ў вершы?
Які кажух заяц пашыў да зімы?
Адкажыце пісьмова на пытанні.
Што яшчэ заяц шые для зімы? Для чаго ён гэта робіць?
Пакажыце, як заяц саграває свае вушы і лапкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 47*

## Вялікая літара ў імёнах людзей

**232.** Прачытайце верш. Падлічыце, колькі было дзяцей.

***

Каля горкі
два Рыгоркі,
дзве Марынкі,
дзве Ірынкі,
два Барыскі,
дзве Ларыскі
елі смачныя ірыскі.

*А. Дзеружынскі*

Выпішыце імёны ў сшытак. Падкрэсліце вялікую літару ў імёнах дзяцей.

Імёны людзей пішуцца з вялікай літары. *Сцёпа, Тоня*.

**233.** Прачытайце тэкст. З якой літары пішуцца імёны?

Рая і Вася гулялі на вуліцы. Разам з імі былі Люба і Марына. Пачаўся вялікі снегапад. Рая і Вася пабеглі дадому. Люба і Марына схаваліся пад дахам дома.

Спішыце ў сшытак. Падкрэсліце імёны дзяцей.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**234.** Разгледзьце малюнак. Упішыце ў сказ імёны хлопчыкаў і дзяўчынак, якія гуляюць у валейбол.



У валейбол гуляюць: ... , ... , ... , ... , ... , ... .

Імёны для выбару: *Андрэйка, Аліса, Галінка, Васілёк, Ірынка, Стась.*

***235.** Складзіце са складоў левага і правага слупкоў імёны дзяцей. Запішыце іх у сшытак.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Гану | | | Крысцін | | |
| Мары | → | ля | Сымон | → | ка |
| То | | | Мікол | | |
| Га | | | Паўлін | | |
| | | | Ян | | |
| | | | Парас | | |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**236.** Дапішыце сказы. Запішыце ў сшытак імёны сваіх сяброў, вучняў у класе.

1. Майго суседа (маю суседку) па парце завуць ... .
2. Са мной сядзіць ... .
3. Добра чытае ... .
4. Прыгожа піша ... .

## *Урок 48*

***237.** Прачытайце верш.

**Памочніца**

Я зусім яшчэ малая,
але ўсім дапамагаю:
тату — чай падсаладзіць,
маме — міскі перамыць
і заўсёды брату Сашу
памагаю есці кашу.

*Н. Парукаў*

Напішыце ў сшытку сказы.

| | | |
|---|---|---|
| | тату _______________ . | |
| Дзяўчынка дапамагае | маме _______________ . | |
| | брату Сашу _________ . | |

**238.** Прачытайце тэкст.

Дзве сястрычкі пасварыліся.
— Маня, я падам дзеду вады.
— Не, Галя, я падам дзеду вады.
— Не, я...



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паспрачаліся дзве сястрычкі Маня і Галя. А дзед застаўся без вады!

*А. Дыбча*

Спішыце ў сшытак два апошнія сказы.

Падкрэсліце вялікую літару ў імёнах дзяўчынак.

Раскажыце, як вы клапоціцеся аб сваіх дзядулях і бабулях.

**239.** Прачытайце тэкст.

Мама Люды працуе даяркай. Люда пасля школы хутка робіць урокі і бяжыць на ферму. Яна поіць цялятак. Цялятки даверлівыя, як дзеці. Мама вучыць Люду даіць кароў.

Чаму Люда хутка робіць урокі?

Што яна робіць на ферме?

Якія цяляткі?

Што даюць каровы?

Спішыце ў сшытак сказы пра Люду.



## Хвілінка-весялінка

**240.** Прачытайце смяшынку. А як вы думаеце, трэба мыць рыбу ці не? Чаму?

— Янка, чаму ты не мыеш рыбу? — спытала бабуля Ганна ў свайго ўнука.

— А навошта? Яна ж у вадзе жыве.

*А. Дунько*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**241.** Параўнайце напісанне літар **У** і **Ч**. Пакажыце рукой, куды павернута «нага» ў літары **У**, а куды — у літары **Ч**. Запішыце літары і словы ў сшытак па ўзоры.

*У–Ч Ч–У Чэся – Усцін*

### *Урок 49*

***242.** Прачытайце. Запішыце сказы ў сшытак.

Соня мые насоўку. Саня мые шкарпэткі.

Пакажыце, як мыюць, палошчуць, выціскаюць і развешваюць насоўкі і шкарпэткі.

**243.** Праслухайце верш І. Муравейкі.

**Для чаго снягір каляровы?**

Петрусёк у дзень зімовы
запытаў у снегіра:
— Для чаго ты каляровы
і чырвоны, як зара?

Каля хлопца птушка скача...
— Адкажу табе, сябрук:
каб мяне хутчэй ты ўбачыў
і хоць жменьку даў мне круп.

Якое пытанне Петрусёк задаў снегіру?

Што адказаў хлопчыку снягір?

Падумайце і адкажыце: ці з’яўляецеся вы сябрамі птушак? Як вы ім дапамагаеце ў халодную зіму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**244.** Прачытайце тэкст. Запішыце ў сшытак сказы пра хлопчыкаў.

Алеся несла пакет з яблыкамі. Пакет парваўся. Яблыкі пасыпаліся на зямлю. Алеся заплакала. Сяргей супакоіў дзяўчынку. Валодзя дапамог сабраць яблыкі.

Пакажыце, што б вы рабілі ў гэтай сітуацыі.

**245.** Прачытайце тэкст. Як вы разумееце яго назву?

### Паспяшыш — людзей насмяшыш

Хлопчык Стэнікэ з бацькам былі ў лесе. Дайшлі да ручая. А кладкі няма. Бацька ўважліва паглядзеў і параіў абысці ручай.

Стэнікэ вырашыў пераскочыць ручай. Хлопчык упаў на сярэдзіну ручая.

*Паводле А. Скабіале,*
*пераклаў з малдаўскай мовы У. Паўлаў*

! **Кла́дка** — гэта дошка, бервяно для пераходу.

Спішыце ў сшытак два апошнія сказы тэксту і прыказку.



## Хвілінка-весялінка

**246.** Прачытайце верш.

### Пра Сцяпана і смятану

Сцяпан сягоння спаў пагана:
да рання снілася смятана,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

але ў Сцяпана, як на зло,
з сабою лыжкі не было.
Ён з лыжкай спаць паклаўся рана,
ды не прыснілася смятана.

*Г. Бойка*

Што вы параіце Сцяпану браць у сны?

*Урок 50*

## Вялікая літара ў імёнах па бацьку

**247.** Прачытайце тэкст.

У хаце — маленькія дзяўчынкі Аленка і Марыся і хлопчык Петрык. Іх брат Алёша ў школе. Дзядзька Уладзімір Сямёнавіч чысціць снег. Бабулька Ларыса Іванаўна вяжа рукавічкі.

Спішыце ў сшытак сказы пра дзядзьку і бабульку. Падкрэсліце вялікую літару ў імёнах і імёнах па бацьку.

Імёны па бацьку пішуцца з вялікай літары.

Настаўніца *Тамара Пятроўна*, урач *Яўген Мікалаевіч.*

**248.** Прачытайце.

Настаўніцу завуць Ніна Іванаўна. Імя і імя па бацьку ўрача — Ігар Пятровіч. Повара завуць Галіна Арцёмаўна.

Запішыце ў сшытак імёны і імёны па бацьку. Падкрэсліце вялікія літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**249.** Прачытайце тэкст.

### Мая настаўніца

У свой вольны час я люблю маляваць, спяваць, танцаваць на школьнай сцэне.

Усяму гэтаму мяне навучыла настаўніца Алена Альбінаўна. Яна прыгожая, добрая, працавітая. Алена Альбінаўна добра спявае і танцуе і заўсёды рыхтуе наш клас да свята.

Нам вельмі падабаецца наша настаўніца.

*Света Яновіч*

Чым любіць займацца Света ў вольны час?

Хто яе гэтаму навучыў?

Як завуць настаўніцу? Як яе імя́? Як яе імя па бацьку?

Да каго звяртаюцца па імені? А да каго — па імені і імені па бацьку?

Выпішыце ў сшытак два сказы пра настаўніцу дзяўчынкі. Падкрэсліце першыя літары яе імя і імя па бацьку.

Як завуць вашу настаўніцу? Запішыце.



### Хвілінка-весялінка

**250.** Праслухайце тэкст.

Дзіма ходзіць па пакоі і на ўвесь голас выкрыквае словы. Падышла сястра Вольга:

— Чаго ты крычыш?

— Верш вучу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— А чаго так гучна?

— Ганна Міхайлаўна казала вучыць уголас, лепш запамінаецца.

Назавіце імёны дзяцей і настаўніцы. З якой літары напісаны імёны: вялікай ці малой?

Што азначае «вучыць уголас»?

**251.** Параўнайце напісанне літар **С** і **Э**. Пакажыце рукой, у які бок «глядзіць» адна літара, у які — другая. Запішыце ў сшытак літары і словы па ўзоры.

*С – Э Э – С* *Соня – Эма*

## *Урок 51*

### Вялікая літара ў прозвішчах людзей

***252.** Прачытайце тэкст. Адкажыце на пытанні.

#### Крыўдна і сумна

Я сябравала з Ленай Заркевіч. Разам хадзілі ў школу. Разам гулялі. Бацькі радаваліся нашаму сяброўству.

Лена пасябравала з новай дзяўчынкай Палінай Разумовіч. Цяпер яны ходзяць разам. Са мной не сябруюць. Крыўдна мне і сумна.

*Жанна Макалоўская*

З кім сябравала Жанна Макалоўская?

Чаму радаваліся бацькі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З кім Лена Заркевіч пасябравала?

Чаму Жанне крыўдна і сумна?

Што трэба было б зрабіць Лене і Паліне, каб Жанне не было сумна? (Сябраваць утрох, хадзіць у школу разам.)

Запішыце ў сшытак першую частку тэксту. Падкрэсліце першыя літары ў імені і прозвішчы.

Прозвішчы людзей пішуцца з вялікай літары. *Марыя <u>К</u>вітко. Аляксей Іванавіч <u>З</u>іневіч.*

**253.** Прачытайце тэкст. Што дзеці жадаюць Юлі Антаневіч?

У Юлі Антаневіч сёння дзень нараджэння. Мама прынесла ў школу торт і цукеркі. Сябры падарылі ёй цудоўны букет кветак. Маша Бельская падпісала паштоўку:





**Дарагая Юлечка!**

Віншуем цябе з днём нараджэння!
Зычым табе здароўя і поспехаў у вучобе.



*Твае аднакласнікі*

Запішыце ў сшытак з вялікай літары імёны і прозвішчы дзяўчынак. Вялікую літару падкрэсліце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**254.** Складзіце і запішыце ў сшытак па ўзоры папярэдняга практыкавання віншавальную паштоўку сябру або сяброўцы. Напішыце сваё імя і прозвішча з вялікай літары.



**Паразмаўляем**

**255.** Разыграйце знаёмства ў пары па ўзоры.

Дзяўчынкі пазнаёміліся:
— Як цябе завуць?
— Тоня Дземідовіч. А цябе?
— Раіса Антонік.
— Вельмі прыемна.

**256.** Назавіце імёны і прозвішчы вучняў свайго класа. Дапішыце сказы.

1. Я сяджу з … … . 2. Каля акна сядзіць … … . 3. Я сябрую з … … .

*Урок 52*

## Вялікая літара ў мянушках жывёл

**257.** Прачытайце сказы.

1. У каровы Рыжухі — бычок Дымочак. 2. У сабакі Жучкі — шчаня Шарык. 3. У кошкі Муркі — кацяня Шустрык.

Спішыце ў сшытак сказы. Падкрэсліце першую літару ў мянушках жывёл.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Мянушкі жывёл пішуцца з вялікай літары. Сабака _Джэк_, кот _Мурзік_.

**258.** Прачытайце і дапоўніце сказы. Спішыце ў сшытак.

Малако дае карова ... .
Мышэй ловіць кот ... .
Хату сцеражэ сабака ... .

Ласун
Мухтар
Чарнуха

**259.** Прачытайце тэкст. Назавіце імёны людзей і мянушкі жывёл.

У каровы Зорачкі — бычок Грыня. Цётка Вера даглядае Грыню. Ёй дапамагаюць вучні Віця і Пеця.

Спішыце тэкст у сшытак. Падкрэсліце першую літару ў мянушках жывёл.

***260.** Каго вы бачыце на малюнках? Дайце жывёлам мянушкі.








Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Карова.
2. Конь.
3. Сабака.
4. Кацяня.

Складзіце і запішыце сказы ў сшытак.

Узор. *Гэта конь Гняды.*

Словы для даведкі: *сабака Бобік, конь Гняды, карова Зорка, кацяня Пусік.*

**261.** Прачытайце словы. Складзіце з імі сказы. Выкарыстайце прыведзеныя ніжэй мянушкі.

1. Брэша ... . 2. Мяўкае ... . 3. Рыкае ... . 4. Квохча ... . 5. Іржэ ... .

Словы для даведкі: *курачка Сняжынка, сабака Шарык, кот Ціішка, карова Мілка, конь Буран.*

## *Урок 53*

***262.** Прачытайце верш.

### Заапарк у двары

Хто ні пройдзе —
кожны гляне.
З чарапахай выйшла Таня,
брат яе трымае дога,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Васілёк — ката малога.
У Дзяніса — трус-бяляк,
у Ігнаціка — хамяк.
Выйшаў з вожыкам Ягор.
Заапаркам стаў
наш двор.

*С. Бестава*

Дайце мянушкі жывёлам. Запішыце ў сшытак.

Узор. *Сабака дог па мянушцы Бім.*

Словы для даведкі: *Пых, Максік, Бім, Чуня, Мурзік, Тупсік*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**263.** Прачытайце тэкст. Раскажыце пра карову Лыску і яе Зорачку.

Гэта наша карова Лыска. Яна дае нам малако. Бабуля робіць з яго смятану, масла і тварог. Мы вельмі ўдзячныя нашай Лысцы. У яе ёсць маленькае цялятка Зорачка.

Запішыце ў сшытак два апошнія сказы. Падкрэсліце першыя літары ў мянушках.

**264.** Прачытайце тэкст.

Гэта наша кабылка Кося. Дзед даглядае кабылку і яе жарабя Шэрага. А кабылка дапамагае дзядулю па гаспадарцы.

Спішыце ў сшытак тэкст. Падкрэсліце першыя літары ў мянушках.

**265.** Прачытайце верш.

***

Раз-два-тры-чатыры-пяць,
выйшаў коцік пагуляць.
— Мяў-мяў-мяў!
Хто б мяне намаляваў!

*Т. Шылько*

Выканайце пажаданне коціка. Дайце яму мянушку. Падпішыце свой малюнак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Спіс выкарыстанай літаратуры

*Бадак, А.* Маленькі чалавек у вялікім свеце / А. Бадак. — Мінск : Ураджай, 1995.

Буся : 2016. — № 2; 2019. — № 4.

*Вітка, В.* Выбраныя творы / В. Вітка. — Мінск : Беларус. навука, 2013.

Вясёлка : 1988. — № 11—12; 1990. — № 1, 2, 5, 7, 10, 11, 12.

*Карнеева, Г. А.* Выпраўленне гукавымаўлення ў дзяцей / Г. А. Карнеева. — Мінск : Нар. асвета, 1998.

*Клышка, А. К.* Верасок / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета, 1978.

*Клышка, А. К.* Чую, бачу, гавару : вучэб. наглядны дапам. / А. К. Клышка. — Мінск : Асар, 2013.

*Старжынская, Н. С.* Займальны матэрыял па навучанню грамаце / Н. С. Старжынская. — Мінск : Нар. асвета, 1989.

*Сторажава, Н. А.* Мова мая і твая. Вучу дзяцей па-беларуску / Н. А. Сторажава. — Мінск : Выд. А. Ванін, 1993.

*Шылько, Т. М.* З роднай мовай дзень за днём / Т. М. Шылько. — Мінск : Нар. асвета, 1999.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Змест

Паўтарэнне .................................................. 3
Тэкст .................................................. 23
Сказ .................................................. 48
Слова .................................................. 97
Слова — назва прадмета .................................................. 97
Спіс выкарыстанай літаратуры .................................................. 134

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Вучэбнае выданне

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Ляшчынская** Таццяна Лаўрэнцьеўна
**Аніскевіч** Святлана Сцяпанаўна

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання
У дзвюх частках
Частка 1

Галоўны рэдактар *А. У. Лясніцкая*

Рэдактар *В. Р. Ермаковіч*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастакі *Д. К. Давыдзенка, Л. А. Мурашка, І. А. Шпунт*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *А. У. Смалюк*
Карэктары *І. С. Балабановіч, Н. Б. Кучмель*

Падпісана ў друк 10.10.2019. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,94 + 0,29 форз. Ул.-выд. арк. 4,3 + 0,2 форз. Тыраж 392 экз. Заказ 531.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сініцы



Суніцы



Журавіны



Журавель



Кавун



Гарбуз



Елка



Ёлка



Дыван



Канапа



Муляр



Цэгла



Маляр



Конь



Конік



Ваўчаня



Ваўчок



Ёрш



Ёрш